Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
№171 (28535)
6 ВЕРАСНЯ 2017 г. СЕРАДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
стар. 5–12



Брэнд з легендаў
МС



З хацінкі – у дачу
МС



Роды XXI стагоддзя
СТАР. 13

# КУПАННЕ АМУРА



Мінскі кіроўца Сяргей МАХАНОЎ у дзяцінстве, калі адпачываў у вёсцы, заўсёды дапамагаў конюхам упраўляцца з коньмі, вадзіў іх на выпас, купаў у возеры. Дзіцячае захапленне з цягам часу перайшло ў звычку, у сапраўдную любоў да буланых і вараных. І цяпер, у сталым узросце, Сяргей свой занятак для душы не астаўляе. Больш таго, тры гады таму Сяргей купіў свайго каня пароды «Беларуская вупражная» і кожныя выхадныя прыязджае ў вёску Харуханцы Лагойскага раёна, каб пабыць са сваім Амурам. Тутэйшыя часта назіраюць карціну, як Сяргей, седзячы верхам на Амуры, лёгка пераадольвае штучнае возера.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

## ЛІЧБА ДНЯ

**14 тысяч**

*выпадкаў кіравання транспартным сродкам у стане ап'янення спынена за сем месяцаў гэтага года, паведаміла ўпраўленне ДАІ Міністэрства ўнутраных спраў. За гэты ж час здзейснена 150 ДТЗ па віне нецвярозых кіроўцаў. Гэта на 30,2% менш у параўнанні з аналагічным перыядам 2016 года. Сёлета ў студзені—ліпені ў падобных аварыях загінулі 38 чалавек, больш за 160 атрымалі траўмы.*

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 16° |
| Віцебск | + 12° |
| Гомель | + 16° |
| Гродна | + 16° |
| Магілёў | + 13° |
| Мінск | + 13° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 06.09.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9293 | ▲ |
| Еўра | 2,2929 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0333 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0742 | ■ |

ISSN 1990 - 763X

■ Дзяржава і бізнес

## Прыватнікі на палях. Рэнтабельна?

### Якое месца яны займаюць у сельскай гаспадарцы краіны

**Хочаш зразумець, якое ўражанне твая краіна сапраўды робіць на гасцей — паразмаўляй з замежнікамі. Як правіла, часцей за ўсё нас асацыююць з машынабудаўнічым цэхам, таннымі (па еўрапейскіх мерках) і ў той жа час даволі якаснымі праграмістамі і высакаякаснай сельскагаспадарчай прадукцыяй. Кажучы аб апошнім кірунку, варта адзначыць, што гэта сёння найбольш папулярная асацыяцыя. За мяжой добра ведаюць «на смак» тое, над чым працуюць перадавыя беларускія прадпрыемствы. Аднак не ўвесь сектар належыць дзяржаве. Як і ў многіх цывілізаваных краінах, у нас ствараюцца ўмовы і для прыватнай ініцыятывы ў сельскай гаспадарцы. Больш падрабязна пра гэта расказала начальнік аддзела рэфармавання прадпрымальніцтва і малых формаў гаспадарання Мінсельгасхарча Наталля ЗАНЬКО.**

### Пакуль што толькі два працэнты

Малыя і сярэднія формы гаспадарання ў аграрным сектары краіны прадстаўлены двума відамі: прыватныя фермерскія гаспадаркі і ўласныя падсобныя гаспадаркі грамадзян. Першыя сёння — найбольш масавыя прадстаўнікі малога прадпрымальніцтва ў аграрным сектары. Сёлета на першае студзеня ў краіне зарэгістравана 3066 фермерскіх гаспадарак, з якіх сельскагаспадарчую дзейнасць ажыццяўляюць 84%. СТАР. 2



■ Сфера інтарэсаў

## Ад «мультыфабрыкі» — да кіберспорту

### Рэспубліканскі тыдзень устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі стартаваў у краіне

**Ён уяўляе сабой своеасаблівую рэкламную кампанію аб'яднанняў па інтарэсах, якая традыцыйна праводзіцца на пачатку навучальнага года. Дні адкрытых дзвярэй, майстар-класы, выстаўкі творчых работ, кансультацыі для дзяцей і іх бацькоў будуць праходзіць паўсюдна да 9 верасня, а ўрачыстае закрыццё адбудзецца ў суботу ў Брэсце.**

— Сёння ў сістэме дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі працуюць 297 устаноў і 31 тысяча аб'яднанняў па інтарэсах 12 профіляў, — расказала журналістам **галоўны спецыяліст упраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы Міністэрства адукацыі Таццяна ДРАПАКОВА.** — Разнастайнасць і варыятыўнасць адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дазваляе кожнаму, у залежнасці ад яго патрэб і схільнасцяў, знайсці сабе занятак па душы. А задача педагогаў дадатковай адукацыі — дапамагчы зарыентавацца ў гэтым моры магчымасцяў. Для гэтага і праводзяцца паўсюдна дні адкрытых дзвярэй...

Дадатковая адукацыя не толькі дазваляе арганізаваць вольны час дзяцей і падлеткаў. Не менш важна, што яна стварае ўмовы для асобаснага і прафесійнага самавызначэння навучэнцаў. Не ўсе дзеці паспяховыя ў школе, але ў сістэме дадатковай адукацыі яны могуць сябе рэалізаваць, асабліва калі трапляюць у групу аднадумцаў, з якімі робяць агульную справу. Гэта вельмі важна ў эпоху інтэрнэту і гаджэтаў, якія пазбаўляюць дзяцей рэальных стасункаў і ўскладняюць іх сацыялізацыю...

Кожная з рэспубліканскіх устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі збіраецца прапанаваць у гэтым годзе, акрамя традыцыйных, таксама і новыя кірункі. СТАР. 3

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!
ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ ЛЯДОЎНЮ АБО ВЯНДЛЯРНЮ
Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# АД ЖНІВА ДА ВУЧЭННЯЎ

## Прэзідэнт правёў нараду з сілавікамі, на якой быў разгледжаны шырокі спектр пытанняў

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ўчора сустрэўся з кіраўніцтвам Дзяржаўнага сакратарыята Савета бяспекі, праваахоўных органаў і ведамстваў сістэмы гарантавання нацыянальнай бяспекі.**

### Арыфметыка ўраджаю

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што месяц таму на рабочай нарадзе з кіраўніцтвам Дзяржсакратарыята ён ставіў канкрэтныя задачы перад сілавымі ведамствамі, — забяспечыць жорсткі кантроль за ходам уборачнай кампаніі.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: ніякага вяртання да савецкай сістэмы тут няма.

— Гэта нядбайнасць нам потым дорага абыходзіцца, — канстатаваў ён. — Можаце палічыць: калі б мы згубілі, як у нас заўсёды плануюць вяскоўцы і кіраўнікі сельгаспрадпрыемстваў, 10% ураджаю — гэта, маўляў, натуральная страта... Ну і з 10 мільёнаў сабранага — колькі б мы згубілі? Мільён тон. Памножце на 200 долараў прыкладна — сусветная цана...

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся ў праваахоўнікаў, пракуратуры, што іх турбавала падчас уборкі, на што трэба будзе звярнуць увагу.

### За свае грошы трэба змагацца

Эканамічная бяспека — не менш важная. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу ўдзельнікаў нарады на «неабходнасць пастаяннага і актыўнага ўдзелу дзяржорганаў у сістэме гарантавання нацыянальнай бяспекі ў развіцці эканомікі».

— Прычым справа, зноў жа, не ў закручванні гаек, — дадаў кіраўнік краіны. — Ніякіх гаек мы закручваць не збіраемся. У сувязі з гэтым яшчэ раз трэба звярнуць увагу на праграмоўку крымінальнага і міжнароднага заканадаўства. Усё лішняе прыбраць. Гэты працэс ідзе.

Як адзначыў Прэзідэнт, устарэлыя нормы нам у заканадаўстве не патрэбны. У сваю чаргу, новыя нормы павінны садзейнічаць развіццю эканомікі.

Наша дзяржава праводзіць актыўную экспартную палітыку. Але, на жаль, не заўсёды за прададзеную прадукцыю нашы прадпрыемствы атрымліваюць грошы своечасова.

— Генеральнаму пракурору былі даручэнні па дэбіторскай запазычанасці, па выплаце заработнай платы — узяць на кантроль, — паведаміў Аляксандр Лукашэнка.

Спытаў кіраўнік краіны і пра зарплаты. Так, на кожным прадпрыемстве яны павінны выплачвацца своечасова — без варыянтаў.

### Нападаць ні на кога не збіраемся

14 верасня пачнуцца сумесныя беларуска-расійскія вучэнні «Захад-2017». Якая сітуацыя ў гэтым плане?

— Ёсць армія, ёсць сумесная групоўка, узброеная на заходнім кірунку Беларусі і Расіі, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — А раз яна існуе — мы ні ад кога гэтага не ўтойвалі, мы яе будзем вучыць ваяваць. На ўсялякі выпадак. Нападаць яны ні на кога не збіраюцца.

Прэзідэнт нагадаў, што паназірацъ за вучэннямі ў Беларусь запрасілі ўсіх ахвотных.

Кіраўнік дзяржавы паведаміў, што на нарадзе ён таксама хацеў бы абмеркаваць такія тэмы, як правы непаўналетніх, папярэджанне выпадкаў гвалту ў сем'ях, злоўжыванне алкаголем.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

### У ТЭМУ

**Станіслаў ЗАСЬ, дзяржаўны сакратар Савета бяспекі,** расказаў пра працу сілавікоў падчас уборачнай кампаніі:

— Праведзены немалыя работы па многіх гаспадарках. Мэта была адна — прадухіліць безгаспадарлівасць, выпадкі крадзяжоў, забяспечыць захаванасць і ўраджаю, і таварна-матэрыяльных каштоўнасцей, кантроль за эксплуатацыяй тэхнікі... Можна адзначыць, што першы этап уборачнай кампаніі ў краіне прайшоў дастаткова арганізавана. Тая работа, якую праводзілі праваахоўныя органы, дала свой рэзультат: у гэты перыяд мы пазбеглі сур'ёзных здарэнняў, істотных страт ураджаю.

Па эксплуатацыі машын у нас адзначана дзевяць выпадкаў узгарання тэхнікі ў палях. Па кожным выпадку ідзе разбор. Акрамя гэтага, былі выпадкі ўзгарання і сховішчаў, і сушылак.

**Аляксандр КАНЮК, генеральны пракурор,** адзначыў, што такая з'ява, як пратэрмінаваная знешняя дэбіторская запазычанасць мае месца быць з-за некарэктнай працы замежных тавараправодных сетак. Гэтая запазычанасць перад айчыннымі прадпрыемствамі сёння складае больш за 500 мільёнаў долараў!

— Гэта праблема, відаць, усё-такі кампетэнцыі кіраўнікоў тавараправодных сетак, іх добрасумленнасці, — лічыць генеральны пракурор. — Прэзідэнт даручыў пад эгідай Дзяржсакратарыята Генеральнай пракуратуры і Савета Міністраў гэтае пытанне прааналізаваць і прадставіць сваё бачанне. Шмат праблем у дзейнасці тавараправоднай сеткі, у тым ліку крымінальнага характару.

**Андрэй РАЎКОЎ, міністр абароны,** гаворачы пра блізкія беларуска-расійскія вучэнні, заявіў:

— Падрыхтоўка вучэнняў увайшла ў сваю завяршальную фазу. Таму мы кажам пра тое, што органы кіравання і войскі да выканання задач гатовы. Для гэтага створаны неабходныя групоўкі ў раёнах выканання вучэбна-баявых задач. Гэтымі раёнамі будуць з'яўляцца шэсць палігонаў Узброеных Сіл і два ўчасткі мясцовасці.

Што да трывогі, якую выказваюць суседнія дзяржавы з-за мерапрыемства, то міністр запэўніў: гэта часова.

— Калі мы праводзім у Мінску парад, таксама вельмі шмат пішуць, расказваюць розныя жахі і іншае. Парад заканчваецца — і пісаць перастаюць. Тое ж будзе і пасля вучэнняў, — упэўнены Андрэй Раўкоў.

# ЦАНІЦЬ ЛЮДЗЕЙ І ПРАЦАВАЦЬ

## Прэзідэнт сустрэўся з лідарам расійскіх камуністаў

**Учора кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка сустрэўся са старшынёй Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Расійскай Федэрацыі, кіраўніком фракцыі КПРФ у Дзяржаўнай Думе Федэральнага сходу Расіі Генадзем Зюганавым.**

Падчас размовы закранулася тэма інфармацыйнай палітыкі Беларусі і Расіі. Што б ні казалі, а мы ў гэтым плане больш лаяльныя за ўсходняга суседа. Генадзь Зюганаў звярнуў увагу на тое, што ў Беларусі расійскія тэлеканалы транслююцца «без выняткаў». Аляксандр Лукашэнка пацвердзіў, што гэта сапраўды так:

— Але калі мы звярнуліся да расіян — і да маскоўскіх улад, і да цэнтральных — што трэба ведаць, як, у рэшце рэшт, жыве «малодшы брат»... А масквічы «заламілі» ледзь не 30 мільёнаў долараў... Мы нічога не баімся, мы паказваем, як жыве наш «старэйшы брат».

Беларускі лідар падкрэсліў, гаворачы пра ідэалогію Камуністычнай партыі Расіі:

— Вашы ідэі нам не чужыя. Больш за тое, у адрозненне ад многіх постсавецкіх рэспублік мы імкнёмся — і многае ў нас атрымліваецца — з рэалізацыяй гэтых ідэй. Таму ідэя, што рынак нас выратуе, што капіталізм — гэта адзіная сістэма, якая можа сёння існаваць, — гэта поўная лухта. Трэба проста працаваць і цаніць людзей.

Пазней у размове з журналістамі Генадзь Зюганаў паведаміў: абмяркоўваліся тэмы не толькі палітычныя, але і даволі канкрэтныя, эканамічныя. Гэта і прамысловая кааперацыя, і сельская гаспадарка, і распрацоўка мадэляў электрамабіляў.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

# Прыватнікі на палях. Рэнтабельна?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Наталля Занько адзначае, што фермерскі сектар з'яўляецца адным з тых, што найбольш дынамічна развіваюцца. «Агульная плошча зямель, якія аддалі для апрацоўкі прыватным прадпрымальнікам з 1995 па 2016 год, пашыралася ў тры разы і на 1 студзеня склала 194,5 тысячы гектараў. Зараз на адну фермерскую гаспадарку прыходзіцца ў сярэднім каля 70 гектараў зямлі», — расказала эксперт.

У вытворчай дзейнасці фермерскіх гаспадарак назіраецца ўстойлівы рост прадукцыі раслінаводства. Аднак пры гэтым у 2016 годзе фермерскімі гаспадаркамі выраблена толькі крыху больш за два працэнты сельгаспрадукцыі. «Выраблена больш за 150 тысяч тон збожжа, каля 350 тысяч тон бульбы і столькі ж гароднiны. Пладоў і ягад — амаль 44 тысячы тон. Сёлета на першае студзеня ў фермерскіх гаспадарках змяшчалася 14,9 тысячы галоў буйной рагатай жывёлы, 30,7 тысячы свіней, 17,7 тысячы галоў авечак, 119 тысяч птушак усіх відаў. Летась вытворчасць малака ў параўнанні з папярэднім перыядам узрасла на 9%, жывёлы і птушкі ў жывой вазе на 2,8%», — растлумачыла Наталля Занько.

### Гатовы падтрымаць

Фермерам даводзіцца сутыкацца з вялікай колькасцю праблем у вырошчванні ўраджаю. Для іх сёння вельмі актуальная дзяржаўная падтрымка. «На дзяржаўным узроўні летась выдзяляліся льготныя крэдыты на суму 176,1 тысячы рублёў. У ходзе рэалізацыі Указа Прэзідэнта №146 «Аб фінансаванні і закупцы сучаснай тэхнікі і абсталявання» з фермерскімі гаспадаркамі заключана на льготных умовах 63 дагаворы лізінгу», — праінфармавала спецыяліст.

Па яе словах, у гэтай пяцігодцы развіццё фермерскага сектара вызначана прыярытэтным напрамкам дзяржаўнай праграмы развіцця аграрнага бізнесу. Асноўным мэтавым паказчыкам гэтай праграмы вызначаны індэкс вытворчасці прадукцыі сельскай гаспадаркі, які да 2020 года павінен скласці 282,5% да 2011 года. Акрамя таго, прадугледжваецца стварыць у фермерскім сектары дадаткова не менш за 3,5 тысячы працоўных месцаў і павялічыць колькасць работнікаў прыватных гаспадарак да 12,5 тысячы чалавек. Сёлета ў адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў па фінансаванні фермерскіх гаспадарак з рэспубліканскага бюджэту прадугледжана выдзеліць 635 тысяч рублёў. «Таксама фермерскія гаспадаркі ў нас удзельнічаюць не толькі ў праграме падтрымкі малых формаў гаспадарання, але і ў іншых. Напрыклад, у дзяржпраграме развіцця аграрнага бізнесу», — нагадала Наталля Занько.

Акрамя таго, для фермерскіх гаспадарак дзяржавай прадугледжаны ўскосныя меры падтрымкі. На працягу трох гадоў з дня іх рэгістрацыі яны вызваляюцца ад выплаты падаткаў, збораў пошлін у часткі дзейнасці па прадукцыі раслінаводства і жывёлагадоўлі. За фермерскімі гаспадаркамі таксама захавана права на выплату адзінага падатку для вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі.

### Навошта весці гаспадарку, калі ёсць крама?

Колькасць прыватных падсобных гаспадарак, на жаль, памяншаецца. У пачатку гэтага года іх налічвалася 997 тысяч, але аб'ём пасяўных плошчаў пад іх летась у параўнанні з 2015 годам скараціўся на 2,1%. «Скарачэнне ідзе і па буйной рагатай жывёле, свіннях і птушцы. Гэта можна звязаць з даступнасцю прадуктаў харчавання для сельскага насельніцтва ў крамах і адсутнасцю неабходнасці з-за гэтага займацца ўласнай падсобнай гаспадаркай», — растлумачыла спецыяліст. У Мінсельгасхарчы за гэтай тэндэнцыяй назіраюць і імкнуцца стварыць умовы, якія б падштурхнулі грамадзян займацца гаспадаркай. Так, у рамках дзяржпраграмы ім аказваецца падтрымка ў выглядзе выплаты надбавак на выраблены прадукцыю.

Пры гэтым сёння для фізічных і юрыдычных асоб захоўваюцца нішы, якімі не займаюцца буйныя дзяржаўныя гаспадаркі. Сюды можна аднесці вырошчванне ягад, іх збор. Не менш цікавым кірункам застаецца развіццё страусавых фермаў.

Дзяржава гатова і выдзеліць неабходную зямлю. «Для вядзення фермерскай гаспадаркі грамадзянам выдзяляецца зямля з фонду запасу. Калі гэты фонд адсутнічае, то фермерам могуць адмовіць, але гэтага практычна не бывае. Можа быць і такая сітуацыя, што фонд запасу мае землі, якія нязручныя па размяшчэнні для фермера. Аднак зямлю гатовыя даць практычна ўсім і заўсёды. Было б жаданне працаваць», — рэзюмавала Наталля Занько.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*kryzhevich@zviazda.by*

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Пуцін даручыў унесці ў Савет Бяспекі ААН рэзалюцыю аб размяшчэнні міратворцаў у Данбасе

Расія ўнясе ў Савет Бяспекі ААН рэзалюцыю аб размяшчэнні міратворцаў ААН на лініі размежавання ў Данбасе для гарантавання бяспекі супрацоўнікаў АБСЕ. Пра гэта заявіў прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін на прэс-канферэнцыі па выніках саміту БРІКС.

Паводле яго слоў, размяшчэнне сіл ААН, якія гарантуюць бяспеку місіі АБСЕ ў Данбасе, пойдзе на карысць «вырашэнню праблемы на паўднёвым усходзе Украіны». «Міністр [замежных спраў Расіі Сяргей Лаўроў] тут, будзем лічыць, што гэта — даручэнне міністэрству замежных спраў унесці адпаведную рэзалюцыю ў Савет Бяспекі», — дадаў Пуцін. Ён сказаў, што ў гэтым кантэксце наяўнасць міратворцаў ААН — дакладней, «тых людзей, якія гарантуюць бяспеку місіі АБСЕ», — ён лічыць «цалкам дарэчнай».

### Паўднёвая Карэя адкажа на ядзерныя выпрабаванні КНДР новымі санкцыямі і ціскам



Рэспубліка Карэя распачне жорсткія меры ў адказ на новыя ядзерныя выпрабаванні, праведзеныя КНДР, але пры гэтым працягне пошук шляхоў вырашэння гэтай праблемы. Пра гэта ўчора заявіў паўднёвакарэйскі прэзідэнт Мун Чжэ Ін у сваім першым інтэрв'ю для расійскіх СМІ.

«Цяперашнія ядзерныя выпрабаванні Паўночнай Карэі з'яўляюцца нашмат больш сур'ёзнымі, чым усе папярэднія», — заўважыў лідар Рэспублікі Карэя. «Сеул, з аднаго боку, будзе рэагаваць на іх самым рашучым чынам, у тым ліку ўзмацненнем жорсткасці санкцый, узмацненнем ціску і рэзкім павышэннем боегатоўнасці», — падкрэсліў прэзідэнт.

### «Адмірал Эсэн» знішчыў «Калібрамі» ў Сірыі пункты кіравання тэрарыстаў



Па звестках мінабароны Расіі, удар быў нанесены па раёне, які ўтрымліваўся баевікамі ІД — выхадцамі з Расіі і краін СНД.

Пускі крылатых ракет «Калібр» праведзены па некалькіх каналах і выяўленых цэлях тэрарыстаў ІДІЛ. «У выніку ракетнага ўдару былі знішчаныя пункты кіравання і вузел сувязі, склады з узбраеннем і боепрыпасамі, а таксама завод па рамонце бронетэхнікі тэрарыстаў і вялікая колькасць баевікоў», — гаворыцца ў паведамленні расійскага ваеннага ведамства.

У мінабароны ўдакладнілі, што ўдар нанесены па раёне, які ўтрымлівалі баевікі — выхадцы з Расіі і краін СНД.

«Удар нанесены па ўмацаваным раёне ў ваколіцах горада Эш-Шала, які ўтрымліваўся бандфарміраваннямі, аснову якіх складалі баевікі — выхадцы з Расіі і краін СНД», — паведамілі ў міністэрстве.

■ Нерухомасць

# ЗЯМЛЯ ПАД ЖЫЛЛЁ ПАДАРАЖЭЛА НА 12%

Кадастравы кошт зямельнага ўчастка ў 25 сотак пад жылую сядзібную забудову ў Мінскім раёне складае ў сярэднім 31 тысячу рублёў

**Нагадаю, што сёлета ў Нацыянальным кадастравым агенцтве завяршыліся работы па кадастравай ацэнцы зямель жылой сядзібнай зоны і рэкрэацыйнай зоны. У чэрвені матэрыялы былі накіраваны на разгляд і зацвярджэнне ў мясцовыя органы ўлады. Найбольш высокі кадастравы кошт зямель сярод сельскіх населеных пунктаў быў зафіксаваны ў Мінскім раёне (у сярэднім 30,8 тысячы рублёў за ўчастак у 25 сотак), у Дзяржынскім і Смалявіцкім (7—7,8 тысячы), у Брэсцкім і Гомельскім раёнах (ад 5,6 тысячы да 8,9 тысячы рублёў), адзначыў намеснік генеральнага дырэктара Нацыянальнага кадастравага агенцтва Дзмітрый РЫТВІНСКІ.**

Спецыялісты дзяржаўнага агенцтва паведамляюць, што кошт зямель павялічвае блізкасць буйнога горада ці райцэнтра, прыпынкаў чыгуначнага транспарту, міжнародных і рэспубліканскіх аўтадарог, буйных вадаёмаў, вадасховішчаў, рэк і азёр, а таксама наяўнасць асфальтаванага пад'езда і высокая колькасць насельніцтва. Пры разліку кадастравага кошту зямель сельскіх населеных пунктаў у абласных раёнах і Дзяржынскім раёне ўлічваліся таксама наяўнасць або магчымасць падключэння да інжынерных камунікацый (газа-, вода-, цеплазабеспячэнне, водаадвядзенне і электразабеспячэнне) у ацэначнай зоне, а не на канкрэтным зямельным участку. Астатнія землі ацэнены без уліку гэтых фактараў.

У параўнанні з вынікамі мінулых кадастравых ацэнак, большасць якіх былі праведзены па стане на 1 студзеня 2010 года, кадастравы кошт зямель пад жылую сядзібную забудову ў сельскіх населеных пунктах Беларусі вырас у 7 разоў у рублёвым выражэнні, у доларавым — на 12%. Павелічэнне кошту ў беларускіх рублях звязана са змяненнем курса нацыянальнай валюты з даты мінулай кадастравай ацэнкі зямель, у доларах — са змяненнем цэн на рынку нерухомасці і з улікам іншых фактараў, якія ўплываюць на кошт. Дзмітрый Рытвінскі падкрэсліў, што працэс кадастравай ацэнкі зямель нельга лічыць завершаным. Застаўся важны этап — зацвярджэнне мясцовымі выканкамамі кадастравага кошту зямель і ўнясенне зацверджаных вынікаў у рэгістр кошту зямель, зямельных участкаў Дзяржаўнага зямельнага кадастру. Толькі пасля гэтага грамадзяне і юрыдычныя асобы змогуць выкарыстоўваць кадастравы кошт для мэт, прадугледжаных заканадаўствам, за выключэннем падаткаабкладання. А вось для мэт падаткаабкладання кадастравы кошт стане даступны з першых дзён наступнага года.



Фота БЕЛТА.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

■ Міжкультурны дыялог

# НАША «ВЫЦІНАНКА» Ў АСТАНЕ

## Калектыў са Століна выступіў на «ЭКСПА-2017»

**Ансамбль народнай музыкі «Выцінанка» выступіў з канцэртамі ў Нацыянальным павільёне Беларусі на Міжнароднай спецыялізаванай выстаўцы «ЭКСПА-2017». Пра гэта «Звяздзе» паведамілі ў Столінскім райвыканкаме.**

— За тры дні наш музычны калектыў паказаў 15 канцэртаў на пляцоўках Нацыянальнага павільёна Беларусі, — расказвае **кіраўнік дэлегацыі, начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Васіль ЗАРУБА.** — Акрамя таго, ансамбль выступіў на выставачных пляцоўках Расіі і Аргенціны. Самабытная беларуская культура, песеннае, інструментальнае, з элементамі харэаграфіі майстэрства калектыву выклікала жывую цікавасць і ўспрымалася наведвальнікамі з вялікім задавальненнем. Непадробны інтарэс выклікалі касцюмы нашых артыстаў. Прадстаўнікі розных народаў прасілі сфатаграфавацца з імі.

Ансамбль «Выцінанка» не ўпершыню прымае ўдзел у мерапрыемствах такога маштабу. Два гады таму калектыў на працягу месяца вёў культурнае суправаджэнне Нацыянальнага павільёна Беларусі на Міжнароднай выстаўцы «ЭКСПА-2015» у Мілане (Італія).

Сёлета на сусветны форум у Астану прыязджаюць шматлікія творчыя калектывы Беларусі. Такім чынам краіна пазнаёміць са сваёй нацыянальнай культурай сусветную грамадскасць у больш шырокім дыяпазоне. Дарэчы, заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь ансамбль народнай музыкі «Выцінанка» — адзіны з Брэсцкай вобласці, хто прэзентаваў народную беларускую творчасць на ЭКСПА-2017.

**Падрыхтавала Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

■ Запрашаем

# У МІНСКУ АДКРЫЎСЯ НОВЫ ПАВІЛЬЁН «БЕЛСАЮЗДРУК»



Фота Надзеі БУЖАН.

Ён з'явіўся на вуліцы Кальварыйскай, 4а. У пrасторным павільёне ў большым асартыменце, чым у кіёску, прадстаўлены кнігі і перыядычныя выданні. Прадаецца марожанае, кава. Ёсць таксама тавары да школы: канцылярскія прылады, сшыткі, дзённікі. Усяго ў сталіцы працуе 46 павільёнаў. **Намеснік дырэктара прадпрыемства «Белсаюздрук» Святлана НІКАНАВА** адзначае, што такія гандлёвыя пункты карыстаюцца папулярнасцю ў мінчан. Сюды таксама ахвотней ідзе працаваць моладзь. Сучасныя павільёны, дарэчы, адкрываюцца не толькі ў Мінску. Ёсць яны ў Барысаве і Салігорску.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

# Ад «мультыфабрыкі» — да кіберспорту

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Мабільная і прамысловая робататэхніка, інжынерны дызайн CAD, нейракіраванне, кіберспорт, прататыпіраванне, дапоўненая рэальнасць — такі блок праграм мы плануем запусціць у гэтым навучальным годзе ў нашай установе, — паведаміў **дырэктар Рэспубліканскага цэнтра інавацыйнай і тэхнічнай творчасці Сяргей САЧКО.**

У Рэспубліканскім цэнтры экалогіі і краязнаўства вялікай папулярнасцю карыстаюцца ландшафтны дызайн, гурток юных экскурсаводаў, спартыўны турызм, спартыўнае арыентаванне, скалалажанне... Між іншым, у 2020 годзе скалалажанне будзе ўпершыню прадстаўлена на летніх Алімпійскіх гульнях у Токіа. Гэты від спорту актыўна набірае папулярнасць. Не застаецца ўбаку ад гэтай сусветнай тэндэнцыі і наша краіна.

У бягучым навучальным годзе сумесна з ПРААН на базе Рэспубліканскага цэнтра экалогіі і краязнаўства будзе створаны нацыянальны рэсурсны цэнтр па вывучэнні водных рэсурсаў і каардынацыі дзейнасці «зялёных школ», а ў кастрычніку сумесна з кампаніяй «Кока-Кола» тут адкрыюць сучасную лабараторыю па вывучэнні водных рэсурсаў.

Старшакласнікаў павінны зацікавіць навуковыя аб'яднанні «Батаніка і прыкладная мікалогія», «Генетыка і селекцыя», «Гідрабіялогія» і «Мікрабіялогія», «Глебазнаўства» і «Арніталогія».

У Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі канстатуюць вялікую цікавасць з боку школьнікаў і моладзі да аб'яднанняў па інтарэсах, звязаных з эканамічнай адукаванасцю, інтэлектуальным развіццём, развіццём логікі і эрудыцыі. Для прыкладу, на яго базе дзейнічае гурток інтэлектуальных гульняў «Сакрат» для моладзі ва ўзросце ад 16 да 23 гадоў. А для школьнікаў тут адкрываецца гурток «Мульт-фабрык», дзе дзятву будуць знаёміць з усімі этапамі стварэння мультфільма, а таксама навучаць розным тэхнікам: маляванню, пластылінавай і ляленчай анімацыі, стоп-моўшэн і іншым. Таксама тут аб'яднаны набор у гурток сучаснай харэаграфіі «хіп-хоп».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

■ Стыхія

# ВЕЦЕР ЛАМАЎ ДРЭВЫ І ПЕРАВЯРНУЎ ПРЫПЫНАК

**Непагадзь у панядзелак увечары найбольш «зачапіла» сталіцу.**

Вячэрні шквал, які на некаторы час ахапіў сталіцу ў панядзелак, паваліў у многіх раёнах Мінска дрэвы і нават прыпынак грамадскага транспарту, размешчаны на вуліцы Янкі Брыля. Тры чалавекі былі шпіталізаваны, аднаму з іх патрабуецца аперацыя. Абставіны здарэння зараз вывучае адміністрацыя Маскоўскага раёна мегаполіса.

— Цяпер прыпынак знаходзіцца на рэканструкцыі, — паведаміў **галоўны інжынер УП «Рамаўтадар Маскоўскага раёна Мінска» Сяргей БЯЛЬКОВІЧ.** — Неўзабаве павільён зноў вернецца туды, дзе і быў да непагадзі. Мушу зазначыць, што вецер быў настолькі моцны, што вывернуў канструкцыю разам з яе бетоннай асновай. Аднак спецыялісты ўжо правяраюць, наколькі трывалыя астатнія прыпынкі. Пры неабходнасці прымем меры па далейшым іх умацаванні.

Павалены падчас шквалу прыпынак у сталіцы — не ўнікальны выпадак. У маі 2009 года Мінск таксама апынуўся пад ударам моцнага ветру. Тады на пенсіянерку «прызямліўся» павільён у раёне вуліцы Ваўпшасава. Жанчына трапіла з пашкоджаннямі ў бальніцу.

Усяго, па інфармацыі Мінскага гарадскога ўпраўлення МНС, у сувязі з непагаддзю ў сталіцы былі зафіксаваныя 25 выпадкаў падзення дрэў. Імі былі пашкоджаны 17 аўтамабіляў і дахі двух жылых дамоў. Дрэвы таксама падалі на праезную частку ў некалькіх месцах, пешаходную дарожку, агароджы двух дзіцячых садкоў. Па вуліцы Куйбышава дрэва ўпала на балкон кватэры на пятым паверсе. Супрацоўнікі МНС і іншыя службы праводзілі работы па распілоўцы сствалоў, якія ўпалі. Усяго для ліквідацыі наступстваў кароткатэрміновага ўзмацнення ветру былі задзейнічаны 20 адзінак тэхнікі МНС і 91 работнік. На падтопленых участках праезных частак рух грамадскага транспарту не абмяжоўваўся.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*
**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*





Фота БЕЛТА.

■ Ну і ну!

# ВЁЗ ГЕРАІН... У САБЕ

**Супрацоўнікі сталічнага наркакантролю пры падтрымцы байцоў спецпадраздзялення «Алмаз» затрымалі за незаконны абарот наркотыкаў 44-гадовага грамадзяніна Расіі.**

Як паведамілі ў ГУУС Мінгарвыканкама, аператыўнікі мелі інфармацыю, што мужчына займаецца пастаўкамі наркотыкаў з Масквы ў Мінск. У дзень затрымання ён прывёз чарговую партыю тавару — восем пакункаў гераіну, кожны вагой па тры грамы, якія ў далейшым планавалася прадаць. Прычым прывезены быў наркотык у сабе. Замежны госць быў дастаўлены ў бальніцу, дзе пасля наркатычны сродак быў канфіскаваны.

Афіцыйна мужчына нідзе не працуе, жыве ў Мінску ў знаёмых, раней судзімы ў Беларусі за разбой і махлярства. У 2015 годзе ён вызваліўся з месцаў пазбаўлення волі і быў дэпартаваны ў Расію з забаронай на ўезд у нашу краіну на 10 гадоў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

# ЛІТАРАЙ ПРЭМІІ

## Аўтары Выдавецкага дома «Звязда» атрымалі высокія ўзнагароды

**Трэці раз — гэта ўжо амаль закон: у рамках Дня пісьменства называюць творы лепшых айчынных пісьменнікаў. Сёлета ў конкурсе Нацыянальнай літаратурнай прэміі разглядалася каля 40 удзельнікаў, прадстаўнічае экспертнае журы чытала і прапускала ў фінал найлепшых. Усё дзеля таго, каб заахвоціць творцаў працаваць далей больш актыўна і плённа, — такое пажаданне прагучала ў вітанні Прэзідэнта Беларусі, якое зачытаў віцэ-прэм'ер Васіль Жарко: «... Мы зараз з'яўляемся сведкамі прызнання найлепшых твораў і іх аўтараў».**

Выбіраць было з чаго: «З тых больш чым 10 000 найменняў кніг, якія штогод выдаюцца ў нашай краіне, накладам больш за 35 мільёнаў экзэмпляраў, кнігі нашых нацыянальных літаратараў знаходзяць свайго вельмі чуйнага чытача», — адзначыла **міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ** і падкрэсліла ролю дзяржавы: нацыянальны статус прэміі патрабуе высокіх узораў сучаснага пісьменства.


Прэмію Людміле Рублеўскай уручае Васіль Жарко.
Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

«Гэта вельмі знакавая з'ява, што Нацыянальны конкурс на лепшы літаратурны твор менавіта ў Дзень беларускага пісьменства агучвае імёны сваіх пераможцаў. Тыя, хто працуе з пяром у руках, захоўваюць душу народа, змагаюцца за развіццё культуры і літаратуры, якая служыць асновай для іншых кірункаў мастацтва, — растлумачыў **старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай ЧАРГІНЕЦ** і прызнаў: — Для нас, пісьменнікаў, Дзень беларускага пісьменства — своеасаблівы экзамен».

Здавалі яго не толькі сябры Саюза пісьменнікаў Беларусі — прэмія ахапіла шырокае кола творцаў, якія шчыруюць на ніве нацыянальнай літаратуры. Напрыклад, адна з адметных пісьменніц у гістарычнай прозе — Людміла Рублеўская ***(на фота)***, раман за раманам працягвае адкрываць тую Беларусь, што не павінна знікнуць пад покрывам стагоддзяў, фактычна ідзе ўслед за Уладзімірам Караткевічам. Адметна і тое, што Нацыянальнай літаратурнай прэміяй у прозе адзначана яе кніга «Авантуры Пранціша Вырвіча, здрадніка і канфедэрата», што выйшла ў Выдавецкім доме «Звязда» ў 2016 годзе.

Нічога дзіўнага: пад брэндам «Звязда» ад пачатку яго існавання знаходзілі адлюстраванне літаратурныя працэсы, што адбываліся ў маладой рэспубліцы, а ў 20-я гады мінулага стагоддзя газета нават спрабавала выдаваць літаратурны дадатак. І цяпер выбудоўвае творчы дыялог паміж творцамі розных пакаленняў. У тым ліку праз кнігі. Прыемна, што сярод лаўрэатаў у намінацыі «Публіцыстыка» яшчэ адзін аўтар Выдавецкага дома «Звязда» — Зіновій Прыгодзіч са зборнікам «Постаці». Гэтае імя вядомае і чытачам нашай газеты — асобныя партрэты выдатных асоб айчыннай культуры былі прадстаўлены на яе старонках самім аўтарам: мы друкуем лепшае, што варта ўвагі, — даказана адзнакай Нацыянальнай літаратурнай прэміі.

І яшчэ адно імя «нашых» аўтараў: тым, хто даўно выпісвае «Звязду», пісьменнік Васіль Ткачоў вядомы па серыі матэрыялаў «Жыццёвінкі». Цяпер спадар Ткачоў быў адзначаны ў намінацыі «Драматургія»: за зборнік п'ес «Характары».

А сведчаннем таго, што ў шэрагах супрацоўнікаў Выдавецкага дома «Звязда» жыве творчы дух і вырастаюць новыя зоркі літаратуры, з'яўляецца ўзнагарода ў намінацыі «Найлепшы дэбют». Новай плынню ў літаратуры называюць Маргарыту Латышкевіч і яе паэтычны зборнік «Яблыкі».

Паэзіі наогул пашчасціла сёлета: фактычна адразу некалькі кніг адзначаны высокай прэміяй. Пераможцам у намінацыі «Лепшы твор паэзіі» стаў Анатоль Аўруцін: адзначылі яго кнігу «Прасвятленне». Ды і ў намінацыі «Найлепшы твор для дзяцей і юнацтва» вылучылі паэта Міхася Пазнякова за кнігу «Возера Дзіва».

Паэт Сяргей Давідовіч летась быў лаўрэатам Нацыянальнай літаратурнай прэміі, а сёлета атрымаў Ганаровую грамату Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. «Мы ўсе робім адну справу па паляпшэнні беларускасці і нашага ладу жыцця», — адзначыў ён.

Працуюць на гэта празаікі і паэты, і тыя, хто вывучае беларускую літаратуру, адзначае яе асаблівасці ў мінулым і сёння. Каб падкрэсліць іх працу, існуе асаблівая намінацыя «Найлепшы твор літаратурнай крытыкі і літаратуразнаўства». Крытыка рухае літаратурны працэс, задача крытыка — праўдзіва ацаніць твор ці ўпісаць імя яго аўтара ў гісторыю айчыннай літаратуры. Пераможцам стаў Валерый Назараў з работай «Тайнапіс Андрэя Мрыя». Можа, скажа ён калісьці сваё слова і пра сёлетніх лаўрэатаў Нацыянальнай літаратурнай прэміі: кожны з іх працягвае працаваць і мае магчымасць стварыць тую самую кнігу, «якая зацікавіць усё грамадства».

**Ларыса ЦІМОШЫК.**
*tsimoshyk@zviazda.by*

### Уражанні лаўрэатаў:

**Міхась ПАЗНЯКОЎ:**

— Слова, кніга былі, ёсць і будуць крыніцай адукацыі, асветы. Асновай культуры, той глебай, на якой пад Боскім небам нараджаецца, квітнее, мужнее душа чалавека, душа народа... Пісьменства падарыла свету столькі зорак, і выдатна, што наша дзяржава клапоціцца пра культуру, духоўнасць. Удзяляе ўвагу кнізе, слову, паказвае, што духоўнае здароўе чалавека, народа не менш значнае, а можа, і больш важнае, чым фізічнае.

**Васіль ТКАЧОЎ:**

— Я атрымаў гэтую прэмію, відаць, яшчэ таму, што за маёй спінай шмат аматараў тэатральнага мастацтва нашай Беларусі. Сёння ў рэпертуарах народных тэатраў вельмі шмат маіх п'ес. Галоўны герой маіх твораў — вясковец, чалавек просты, сціплы, які іншы раз трапляе ў няпростыя жыццёвыя сітуацыі і з гонарам выходзіць з іх. Добра, калі бяруць творы прафесійныя тэатры. Але для мяне вялікая ўзнагарода, калі п'есу ставіць народны тэатр, бо гэта людзі, якія ад сваёй працы не маюць нічога, акрамя задавальнення. Я рады для іх пісаць.

**Маргарыта ЛАТЫШКЕВІЧ:**

— Прыемна, што мая работа, укладзеная ў гэтую кніжку, была ацэнена шаноўным журы, вялікі гонар ўзняцца на сцэну разам з мэтрамі. Ёсць і пэўная адказнасць, таму што, атрымаўшы такую ўзнагароду, трэба адказаць на яе ў творчым плане. Я пастараюся гэта зрабіць: ужо ёсць праекты наступных дзвюх кніжак. Адну складуць фантастычныя аповесці — хачу зрабіць зборнік па беларускай міфалогіі. А другая кніжка будзе падобная да «Яблыкаў», проста таўсцейшая.

**Анатоль АЎРУЦІН:**

— Лічу, што калі чалавек стварае і стварае сур'ёзна, то трэба, каб ён выдаваўся пры жыцці. Любы пісьменнік павінен бачыць, што яго праца кімсьці заўважана і кімсьці адзначана. У Беларусі нашмат менш літаратурных прэмій, чым у Расіі і іншых краінах. Напрыклад, Ганкураўская прэмія ў Францыі сімвалічная па суме ўзнагароджання. Але там ёсць сістэма падтрымкі аўтараў пасля гэтага: чалавек, які атрымаў прэмію, умомант становіцца папулярным у выдаўцоў. Нацыянальная літаратурная прэмія ў Беларусі прысуджаецца ўсяго тры гады. Яе трэба развіваць і хацелася б, каб падумалі пра далейшы лёс кнігі, якую адзначылі. Можа быць, варта стварыць бібліятэку лаўрэатаў прэміі, каб падтрымлівалася ўвага да творчасці адзначанага літаратара...

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ:**

— Сёння, у свеце ўніфікацыі, надзвычай важна, каб беларусы ведалі сваю гісторыю. Сапраўдную, якая з'яўляецца часткай еўрапейскай. Каб усведамлялі, што ў гэтай гісторыі было ўсё — і адважныя рыцары, і чароўныя дамы, і вайскаводцы, і паэты. і філосафы... Я імкнуся ў сваёй творчасці разбураць існуючы стэрэатып наконт нашага мінулага, магістральны герой якога для многіх так, на жаль, і застаўся — «мужык-беларус, пан сахі і касы», хоць у таго ж Купалы ёсць і Бандароўна, і Гусляр, і Машэка, вобразы рамантычныя і прыгожыя... Нам яшчэ трэба шмат што вербалізаваць, шмат якіх герояў вяртаць — тое, што ў іншых літаратурах даўно зроблена Вальтэрам Скотам, Генрыкам Сянкевічам ды іншымі. Я пастаралася, каб у маім цыкле авантурна-прыгодніцкіх раманаў «Авантуры Пранціша Вырвіча» чытач патрапляў у такі захапляльны, гераічны і рамантычны свет XVIII стагоддзя на Беларусі, што яму захацелася б больш даведвацца пра беларускую культуру і гісторыю... Каб мае героі — малады збяднелы шляхцюк Пранціш Вырвіч і полацкі доктар Баўтрамей Лёднік — былі добрай альтэрнатывай стэрэатыпнаму беларускаму літаратурнаму герою, каб даводзілі, што наша літаратура — гэта не толькі «пра вёску і пра вайну». Пранціш Вырвіч і Баўтрамей Лёднік — людзі, якія ведаюць, што такое гонар і годнасць, і здольныя іх абараніць, як і волю сваёй зямлі. Назва чацвёртай часткі — «Авантуры Пранціша Вырвіча, здрадніка і канфедэрата» тлумачыцца тым, што героі патрапляюць у цяжкі для нашай зямлі час, апошнія гады Рэчы Паспалітай, калі ваявалі за ўладу розныя магнацкія групоўкі, прыцягваючы іншаземныя сілы, і герояў шпурляе з аднаго віру ў іншы, з аднаго войска ў другое, такім чынам яны для кагосьці ўвесь час з'яўляюцца здраднікамі... Але галоўная іх ідэя — не здрадзіць самім сабе і Радзіме. З усіх сваіх вандровак яны вяртаюцца ў родны Полацак. Беларусь знаходзіцца на скрыжаваннях Еўропы, і яе мультыкультурнасць, мультыканфесійнасць я таксама адлюстроўваю... А каб чытач не нудзіўся, прыпраўляю ўсё аўтарскім гумарам і фантасмагарычнымі дэталямі. Напрыклад, у чацвёртай частцы прыгод чытач трапляе ў падземнае возера пад старажытным Туравам, дзе раскрываецца таямніца знакамітага Турава калодзежа і Жалезнага Змія. Я рада, што ў раманаў з'яўляецца ўсё больш прыхільнікаў, і не толькі ў Беларусі. Час ад часу сустракаю звесткі, што па «Авантурах» праводзяцца квэсты, ладзяцца інсцэніроўкі, нават гуляюць у «Мафію». Аказалася, што і замежнікам цікава з дапамогай Лёдніка і Вырвіча даведацца пра нашу гісторыю, адкрыць для сябе Беларусь, — з'явіліся пераклады і замежныя выданні.



# ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ «СМАК ЖЫЦЦЯ СА «ЗВЯЗДОЙ»



**I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

1. Рэкламная гульня пад назвай «Смак жыцця са «Звяздой» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтымі Правіламі ў тэрмін з 7 верасня па 31 снежня 2017 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на чацвёрты квартал ці другое паўгоддзе 2017 года.

2. Арганізатар Гульні — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (далей — установа), месца знаходжання: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, УНП 100155376.

**II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ**

3. Прызавы фонд рэкламнай гульні «Смак жыцця са «Звяздой» сфарміраваны за кошт маёмасці арганізатара гульні — рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» — і складаецца з наступных рэчаў:

| № п/п | Назва | Колькасць (шт.) | Цана за шт. з ПДВ, руб. кап. | Усяго з ПДВ, руб. кап. |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Маразільнік Indesit SFR 100, Расія | 1 | 479,00 | 479,00 |
| 2. | Вяндлярня электрычная суцэльнаметалічная «ТэрмМікс» | 7 | 81,996 | 573,97 |

УСЯГО прызавы фонд рэкламнай гульні «Смак жыцця са «Звяздой» складае: — 1 052,97 (адна тысяча пяцьдзясят два рублі дзевяноста сем капеек).

**III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ**

4. Рэкламная гульня «Смак жыцця са «Звяздой» праводзіцца з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на чацвёрты квартал ці другое паўгоддзе 2017 года.

5. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які аформіў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» на чацвёрты квартал ці другое паўгоддзе 2017 года.

6. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас установы ў перыяд з 7 верасня па 9 кастрычніка 2017 года выразаная з газеты або з укладыша ў газету запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды», якая змяшчаецца ў газеце не менш чым раз на тыдзень у перыяд з 7 па 30 верасня 2017 года.

7. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які даслаў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

8. Карткі ўдзельніка, наклееныя на паперу ці плёнку, адксеракапіраваныя або тыя, якія паступілі ўстанове пасля 9 кастрычніка 2017 года па паштовым штэмпелі атрымання, да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

**IV. СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГУЛЬНІ**

9. Для правядзення Гульні «Смак жыцця са «Звяздой» установа стварае камісію па правядзенні рэкламнай гульні (далей — Камісія) у наступным складзе:

Крачава Наталля Ільінічна — намеснік дырэктара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» — старшыня Камісіі;

члены Камісіі:

Чычко Аксана Мікалаеўна — начальнік упраўлення распаўсюджвання друкаваных СМІ РУП «Белпошта»;

Міхайлічэнка Алена Віктараўна — загадчык аддзела маркетынгу рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Доўнар Валянціна Аркадзеўна — рэдактар аддзела рэдакцыі газеты «Звязда» рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Сянько Аляксандр Анатолевіч — спецыяліст 1-й катэгорыі адміністрацыйна-гаспадарчага сектара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда».

10. Асобы, якія ўваходзяць у склад Камісіі, не могуць быць удзельнікамі гэтай Гульні.

**V. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ**

11. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 12 кастрычніка 2017 года ў 12 гадзін у памяшканні ўстановы па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

12. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і горадзе Мінску, змяшчаюцца ў асобныя прасторныя скрыні і старанна перамешваюцца.

13. Асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска разыгрываюцца 7 вяндлярняў (па адной для кожнага).

Затым усе карткі змяшчаюцца ў адну скрыню, перамешваюцца і сярод удзельнікаў разыгрываецца суперпрыз — маразільнік.

14. Пераможцам Гульні, які выйграў прыз, лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча напісана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышы кожнага асобнага прыза выцягне выпадковым чынам са скрыні хто-небудзь з запрошаных удзельнікаў Гульні, прадстаўнікоў незалежных арганізацый або членаў Камісіі. На кожнай такой картцы ўдзельніка надпісваецца выйграны прыз і распісваюцца члены Камісіі.

15. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца да 22 кастрычніка 2017 года ўключна ў газеце «Звязда».

Установа ў тэрмін да 22 кастрычніка 2017 года дасылае пераможцам паведамленне аб выйграным прызе заказным пісьмом з указаннем тэрміну яго атрымання.

**VI. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ**

16. Умовай выдачы прызоў з'яўляецца прад'яўленне пераможцам пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на чацвёрты квартал ці другое паўгоддзе 2017 года.

Пры звяртанні па атрыманне прыза прадстаўніка пераможцы ён павінен прад'явіць даверанасць на атрыманне прыза, пашпарт і арыгінал абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на чацвёрты квартал ці другое паўгоддзе 2017 года.

17. Адсутнасць у пераможцы, які выйграў прыз, абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на чацвёрты квартал ці другое паўгоддзе 2017 года з'яўляецца падставай для адмовы ў выдачы яму прыза ў сувязі з тым, што ён не адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да ўдзельніка Гульні пунктам 5 гэтых Правілаў.

18. Прызы выдаюцца пераможцам у тэрмін па 31 снежня 2017 года ў памяшканні ўстановы па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, з 9.00 да 13.00 і з 14.00 да 17.00, за выключэннем выхадных і святочных дзён. Расходы, звязаныя з прыездам пераможцаў па атрыманне прыза, установа не аплачвае.

19. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаецца.

20. Пасля 31 снежня 2017 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

**VII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

21. Пераможцы Гульні нясуць адказнасць за прадстаўленне падатковай справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзейным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

22. Пераможцы Гульні і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, прозвішчы, імёны па бацьку, фатаграфіі, лісты і інтэрв'ю могуць быць выкарыстаны ўстановай у любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, звязаных з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв'ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць установе.

23. Правілы правядзення рэкламнай гульні «Смак жыцця са «Звяздой» да пачатку рэкламнай гульні будуць апублікаваны сумесна з рэквізітамі іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў газеце «Звязда».

24. Даведкі, якія датычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефоне (017) 337 44 04.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №3087 ад 4.09.2017 г., выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

6 верасня
2017 г.
№33 (417)



стар. 3

Самакіраванне па-іспанску



стар. 5

Аб'яўлена паляванне... на турыста



стар. 6

Хто ў доме гаспадар?

ТЭМА ДНЯ

# ДАРОГІ ВЯДУЦЬ... У БЕЛАРУСЬ?



## Як прыцягнуць турыста ў нашу краіну

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**З увядзеннем пяцідзённага бязвізавага рэжыму паток турыстаў да нас дакладна не хлынуў, аднак колькасць замежных наведвальнікаў значна павялічылася. Паводле апошніх звестак, з таго моманту праз аэрапорт Беларусь наведала каля 45 тысяч турыстаў. Часцей за ўсё да нас прыляталі жыхары такіх краін, як Германія, Польшча, Італія, ЗША і Вялікабрытанія. Вядома, развіццё ёсць, аднак заўсёды хочацца большага, таму наш карэспандэнт пагутарыў з трыма экспертамі, каб высветліць, якія праблемы перашкаджаюць належным чынам развіваць турызм, як змяніць сітуацыю ў лепшы бок, а таксама калі ў Беларусь нарэшце прыйдуць танныя авіякампаніі — так званыя лаўкосты — і ці патрэбныя яны.**

### Афіцыйная пазіцыя

На думку **намесніка дырэктара дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь Віталя ГРЫЦЭВІЧА,** турызм у Беларусі развіваецца паступова і ўпэўнена. Найбольш перспектыўнымі кірункамі, здольнымі цягнуць гэту галіну наверх, спецыяліст лічыць санаторна-курортны і аграэкатурызм, дзякуючы якім наша краіна не адзін дзясятак гадоў вядомая ва ўсім свеце.

Акрамя гэтага, сюды можна аднесці прамысловы турызм. «Перавага гэтага кірунку ў тым, што мы даём магчымасць не толькі паглядзець на вытворчасць, але дазваляем і паўдзельнічаць у стварэнні прадукту», — адзначыў Віталь Грыцэвіч.

стар. 4

СВАЯ СПРАВА

# БАГАЦЕЕМ НА ЗЯМЛІ НЕ СТАНЕШ, але на годнае жыццё заробіш

## Так лічыць кіраўнік фермерскай гаспадаркі са Смалявіч

**«На зямлі ніколі не станеш багатым, а станеш гарбатым», — так казалі нашы продкі, ды яшчэ і цяпер сярод людзей старэйшага пакалення бытуе гэтае меркаванне. Але кіраўнік сялянска-фермерскай гаспадаркі «Аграліга», што ў Смалявіцкім раёне, Аляксей КРАПІЎКА сцвярджае, што гэтае паняцце састарэла.**

— Два гады таму, як кажуць, прыпякла эканамічная сітуацыя. Мы сабраліся кіруючым саставам і прыйшлі да высновы: калі хочам не страціць у заробках, выхад у нас адзін — працаваць удвая эфектыўней, — кажа Аляксей Уладзіміравіч.

«Аграліга» заснавана ў 2009 годзе. Спачатку тут займаліся ачысткай гароднiны і фасоўкай паўфабрыкатаў у вакуумную ўпакоўку. Зямлі на той час было нямнога — недзе 57 гектараў. Цягам часу прырасталі новымі плошчамі. Цяпер у гаспадарцы каля 550 гектараў пад бульбай, капустай, морквай, буракамі, цыбуляй, ды іншым. У 2012 тут пачалі вырошчваць і фасаваць у вакуумную ўпакоўку зеляніну: цыбулю, салату, кроп, пятрушку. Прадукцыя пастаўляецца ў рэгіёны Мінскай вобласці, вытворца практычна закрывае патрэбы гандлёвых сетак цэнтральнага рэгіёна.

Дарэчы, сельгаспрадпрыемства адным з першых у краіне пачало выпускаць вакуумную гародніну, па аба-ротах і продажы яму не было роўных. Сёння гэтая вытворчасць не такая прыбытковая, як раней. У Беларусі працуюць 28 ліній толькі па пера-працоўцы бульбы.

стар. 8



Фота Надзеі БУЖАН.

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# УЛІЧАНЫ ЎСЕ МЕРКАВАННІ

*Адбылася пагаджальная нарада*

**Члены Прэзідыума Савета Рэспублікі, старшыні Пастаянных камісій Ірына Старавойтава і Ала Бодак правялі пагаджальную нараду па пытанні падрыхтоўкі законапраекта «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб аўтарскім праве і сумежных правах».**



На нарадзе прысутнічалі члены Савета Рэспублікі, прадстаўнікі Міністэрства сувязі і інфарматызацыі, Міністэрства адукацыі, Міністэрства інфармацыі, Міністэрства культуры, Міністэрства эканомікі, Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях, Вярхоўнага Суда, Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў, Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі. Падчас мерапрыемства ўдзельнікі абмеркавалі пытанні, якія датычацца дапрацоўкі згаданага законапраекта.

# ГАВАРЫЦЕ, ВАС СЛУХАЮЦЬ

*Члены Савета Рэспублікі сустрэліся з выбаршчыкамі*

**У апошнія дні лета сенатары правялі асабістыя прыёмы і прамыя тэлефонныя лініі. Напрыклад, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, генеральны дырэктар птушкафабрыкі «Дружба» Васіль Маркевіч правёў асабісты прыём грамадзян Баранавіцкага і Ляхавіцкага раёнаў і прамую тэлефонную лінію.**

Заяўнікі ўзнімалі пытанні, якія датычацца аказання паслуг насельніцтву арганізацыямі жыллёва-камунальнай гаспадаркі, забеспячэння жыхароў цвёрдымі відамі паліва, удзелу і падтрымкі прадстаўнікоў Баранавіцкага раёна ў міжнародных спартыўных спаборніцтвах, сацыяльнай падтрымкі інвалідаў і інш.

Акрамя таго, на мінулым тыдні грамадзяне маглі звярнуцца з пытаннямі да Ігара Краўчанкі, члена Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, генеральнага дырэктара прадпрыемства «Гомельаблдарбуд», а таксама Вольгі Леўчанкі, члена Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, дырэктара-рэдактара «Пінскага весніка».

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

З НАГОДЫ

# ПРЫЕМНАЕ З КАРЫСНЫМ

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу не засталіся ў баку ад святочных мерапрыемстваў, прысвечаных Дню ведаў. Яны наведалі ўстановы адукацыі, куды прыехалі з каштоўнымі падарункамі.**

Старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч разам з іншымі членамі верхняй палаты парламента, выбранымі ад Мінска, у тым ліку Мар'янай Шчоткінай, віцэ-спікерам верхняй палаты, наведаў сталічны дом-інтэрнат для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Парламентарыі прыехалі ва ўстанову не з пустымі рукамі. Яны набылі спецыяльную мэблю для чатырох класных пакояў, а таксама тэлевізар. Падчас свята дзецям таксама ўручылі ранцы з усімі неабходнымі канцылярскімі прыладамі. Акрамя таго, намеснік старшыні Савета Рэспублікі, старшыня «Беларускага саюза жанчын» Мар'яна Шчоткіна наведала Ждановіцкую спецыяльную агульнаадукацыйную школу-інтэрнат у складзе дэлегацыі Беларускага саюза жанчын.

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзімір Панцюхоў паўдзельнічаў ва ўрачыстай лінейцы ў Чавускай абласной сярэдняй школе, над якой бярэ шэфства ўжо больш як дзесяць гадоў. Парламентарый павіншаваў выхаванцаў і педагагічны калектыў з пачаткам навучальнага года і ўручыў дзецям падарункі і спартыўны інвентар.

Ірына Старавойтава, старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, наведала Клімавіцкі цэнтр карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі і ўручыла ад Савета Рэспублікі падарункавы сертыфікат на набыццё тэлевізара. Акрамя таго, парламентарый прыняла ўдзел у раённай канферэнцыі педагагічных работнікаў «Адукацыя — стратэгічны рэсурс рэгіёна».

Старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Ала Бодак наведала сацыяльна-педагагічны цэнтр (прытулак) Цэнтральнага раёна Мінска. У ходзе мерапрыемства парламентарый пацікавілася патрэбамі цэнтра, а таксама праблемамі, з якімі сутыкаецца яго калектыў. Выхаванцам прытулку сенатар уручыла падарункі — настольныя, рухомыя і іншыя гульні — і спартыўны інвентар, набытыя за кошт спонсарскіх сродкаў.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

# ДЗЕНЬ ВЕДАЎ З СЕНАТАРАМ

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандр Папкоў 1 верасня правёў прафесійна-арыентацыйны ўрок для старшакласнікаў СШ №1 г. п. Лёзна.**



Сярэдняя школа №1 гарадскога пасёлка Лёзна Віцебскай вобласці вядомая яшчэ і тым, што ў ёй паспяхова вучацца прадстаўнікі Маладзёжнай палаты парламента, створанай пры Лёзненскім райсавеце дэпутатаў. Тут з натхненнем успамінаюць нядаўнюю сустрэчу са старшынёй Савета Рэспублікі Міхаілам Мясніковічам, якая адбылася не так даўно падчас наведвання верхняй палаты беларускага парламента маладымі парламентарыямі з глыбінкі.

Запрашэнне на ўрачыстыя мерапрыемствы, прысвечаныя Дню ведаў, старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандра Папкова таксама не выпадковае. На працягу шасці апошніх гадоў сенатар аказвае вялікую практычную дапамогу навучальнай установе па ўкараненні ў адукацыйны працэс новых інфармацыйных тэхналогій, а таксама ў праведзенні рэканструкцыі будынка, тэхнічнага абсталявання кабінетаў, добраўпарадкавання тэрыторыі.

За гэты час некалі звычайная сярэдняя школа раённага ўзроўню ператварылася ў сучасную навучальную ўстанову з оптыка-валаконнай сувяззю і хуткасным інтэрнэтам. Да пачатку новага навучальнага года для вучняў гарадскога пасёлка адкрыты тры новыя камп'ютарныя класы, зробленыя па ўсіх патрабаваннях сучасных адукацыйных тэхналогій, — яны абсталяваныя інтэрактыўнымі дошкамі з магчымасцю доступу да ўсіх сусветных інфармацыйных рэсурсаў, а таксама планшэтамі для індывідуальнага карыстання вучняў і новай мэбляй. Па словах старшыні Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў Тамары Дрылёнак, дзякуючы дапамозе старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Аляксандра Папкова ўдалося цалкам абнавіць прадметна-навучальныя кабінеты, абсталяваць актавую залу, сталовую і дзіцячыя пляцоўкі, усталяваць электронную праходную ў школу і відэаназіранне. «Такая актыўная ўвага да нашых дзяцей з боку сенатара абавязкова адаб'ецца на павышэнні ўзроўню і якасці ведаў, а ў будучыні — на вызначэнні жыццёвай пазіцыі маладых людзей. Бо ўжо зараз вучні старэйшых класаў паказваюць 100- і 96-бальныя вынікі ведаў на прадметных алімпіядах абласнога і рэспубліканскага ўзроўняў».

Першы ўрок сёлета для ўсіх школьнікаў краіны прайшоў пад назвай «Беларусь — мая Айчына». Аляксандр Папкоў правёў яго для вучняў 11-х класаў і прысвяціў абмеркаванню праблем маладзёжнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь. Сустрэча прайшла ў цёплай і вельмі даверлівай абстаноўцы. Моладзь падзялілася сваімі планамі на будучыню і абмеркавала магчымасці і варыянты выбару будучай прафесіі. На развітанне школьнікі запрасілі высокага госця наведаць пладова-ягадны сад, які быў пасаджаны некалькі гадоў таму пры ўдзеле сенатара, і пачаставалі першым ураджаем.

**Наталля БІТЭЛЬ.**

КАРЦІНКІ З ГЛЫБІНКІ

## Дзеці ў хаце

**У Драгічыне адкрылі першы дзіцячы дом сямейнага тыпу.**

Яго гаспадарамі сталі Вольга і Мікалай Манчукі з дзецьмі Уладзіславам, Марыяй, Леанідам і Ульянай, паведамляе «Драгічынскі веснік». На адкрыцці прысутнічаў і старшыня райвыканкама Аляксандр Дарашэнка, які адзначыў, што кожны хлопчык і дзяўчынка павінны жыць у сям'і, якая пра іх клапоціцца. Вольга Манчук працавала настаўніцай-дэфектолагам з праблемнымі дзецьмі, якім не хапае бацькоўскай любові і ўвагі. У рашэнні стаць сям'ёй, якая замяшчае прыёмным дзецям бацькоў, яе падтрымаў муж. Сям'я будзе жыць у доме сямейнага тыпу. На першым паверсе размешчаны гасціная і кухня, на другім — пяць спальняў. Усяго плошча дома займае каля 200 м².



www.dragichin.by

## Палатачны сезон

**Прыхаджане храма Пакроваў Прасвятой Багародзіцы зладзілі традыцыйны паход.**

Сёлета ў ім паўдзельнічала больш за 150 чалавек. Гэта юныя навучэнцы нядзельнай школы, юнакі і дзяўчаты з маладзёжнага брацтва ў гонар святацеля Кірылы Тураўскага і юнацкага клуба ў гонар прападобнамучаніка Афанасія, ігумена Брэсцкага, а таксама іх бацькі. Па звестках «Сельскай праўды», лагер размясціўся ў вёсцы Чыжэўшчына Жабінкаўскага раёна. «Мы заўсёды весела і з карысцю праводзім час на прыродзе, на свежым паветры, адпачываем целам і душой, гуляем у футбол, валейбол, шашкі, арганізоўваем квэст-гульні, спаборніцтвы-падарожжы па станцыях, «Хвіліну славы», дзе кожны паказвае свае таленты і здольнасці, — расказвае Марыя Захарчук, якая ўжо не першы год разам з сям'ёй удзельнічае ў паходзе. — Я лічу, што ў выніку мы становімся дружнейшымі, бліжэйшымі і раднейшымі адно аднаму».

## Падтрымка бізнесу

**На Віцебшчыне пачаўся конкурс інвестыцыйных праектаў.**

Камітэт эканомікі Віцебскага аблвыканкама аб'явіў конкурс інвестыцыйных праектаў суб'ектаў малога бізнесу вобласці для аказання дзяржаўнай фінансавай падтрымкі. Маюцца на ўвазе субсідыі для вяртання часткі працэнтаў па крэдытах або часткі расходаў на выплату лізінгавых плацяжоў па дагаворах фінансавай арэнды ў частцы аплаты сумы ўзнагароды лізінгадаўцы. Конкурсную заяву можна прынесці ў камітэт эканомікі Віцебскага аблвыканкама да 1 кастрычніка.

## Свята ў Сяле

**Дзень вёскі ўпершыню адзначылі ў вёсцы Сяло Лёзненскага раёна.**

На свята сабраліся ўсе мясцовыя жыхары і тыя, чый лёс звязаны з гэтай вёсачкай. Сёння там жыве крыху больш за 20 чалавек. Як паведамляе газета «Сцяг Перамогі», павіншаваць вяскоўцаў прыехалі артысты Барсееўскага сельскага Дома культуры. Свята правялі з песнямі, вершамі і шчырымі размовамі.

## Яшчэ адзін мільён

**Мільённую тону гарачакатаных бясшвовых труб вырабілі на БМЗ.**

Гэта юбілейная партыя Беларускага металургічнага завода з Жлобіна ў хуткім часе будзе адпраўлена ў ЗША. Як паведамляе газета «Новы дзень», знакавы рубеж быў пераадолены брыгадай №1 пад кіраўніцтвам начальніка змены Мікалая Караткова і выконваючага абавязкі майстра Алега Аўсяннікава.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

# ЗАМЕЖНЫ ДОСВЕД

## Беларусы наведалі Краіну Баскаў і пазнаёміліся з прынцыпамі міжмуніцыпальнага супрацоўніцтва

**Дэлегацыя органаў мясцовага самакіравання з розных рэгіёнаў Беларусі нядаўна пабывала ў Іспаніі, а дакладней, у паўночнай яе частцы — Краіне Баскаў. Некалькі дзён беларусы знаёміліся з жыццёвым укладам далёкай краіны, а канкрэтна — з прынцыпамі муніцыпальнага кіравання. Дык што такога асаблівага ў гэтай аўтаномнай правінцыі і чаму нам цікавы іх вопыт? Аб гэтым мы гутарым з удзельніцай паездкі, членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, членам Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання Інэсай БЕЛУШ.**

**— Інэса Генадзеўна, ці можам мы наогул параўноўваць Беларусь і Іспанію, якія маюць такія розныя культуру і традыцыі?**

— Іспанія хоць і вялікая краіна, але падзелена на адносна самастойныя правінцыі, якія па-свойму вырашаюць свае праблемы. Краіна Баскаў — адна з іх, самы вядомы горад — Більбаа. У першую чаргу нас цікавіла, як мясцовыя ўлады вырашаюць пытанні сацыяльных паслуг, занятасці насельніцтва, збору адходаў, экалогіі. Найлепшым вопытам трэба цікавіцца і па магчымасці карыстацца ім.

**— І як там вырашаюцца гэтыя праблемы?**

— Трэба зазначыць, што для іх вырашэння невялікія муніцыпалітэты аб'ядноўваюцца ў асацыяцыі. Гэта дазваляе акумуляваць фінансы, каб накіраваць іх на больш глабальныя праекты. Такая асацыяцыя таксама адстойвае інтарэсы мясцовага насельніцтва пры зацвярджэнні законаў, якія прымаюцца парламентам правінцыі.

**— У Гродзенскай вобласці пачала дзейнічаць асацыяцыя мясцовых Саветаў. Як вы лічыце, што з вопыту іспанцаў яна магла б пераняць?**

— Практыка, якая прымяняецца ў Іспаніі і Краіне Баскаў, у тым ліку салідарнага ўдзелу рэгіёнаў у фарміраванні прыбыткаў, сапраўды прывабная і, можа, нават справядлівая. Але для нашых сельскагаспадарчых раёнаў з перавагай насельніцтва пенсійнага ўзросту яна наўрад ці дасць эфект і палепшыць якасць паслуг. Аб'ядноўваць муніцыпалітэты, ці, як у нашым выпадку, сельсаветы, лепш для прагматычных мэт — будаваць дарогі, аказваць транспартныя паслугі, вучыць роднай мове. На гэта выдаткоўваюцца асабістыя сродкі грамадзян, а таксама сродкі бюджэту ўсіх узроўняў.

**— Фарміраванне бюджэту асацыяцыі баскаў адрозніваецца ад нашага?**

— У нас розныя падыходы. Там сярэднестатыстычны бюджэт напалову фарміруецца за кошт датацый, 25% — гэта мясцовыя падаткі, яшчэ столькі ж — гэта зборы з карыстальнікаў. Так, пры вырашэнні пытанняў водазабеспячэння, каналізацыі, утылізацыі мясцовае насельніцтва абкладаецца дадатковым падаткам на ажыццяўленне канкрэтнага праекта. У той жа час кожны ведае, куды ідуць яго грошы.

У нас мясцовымі Саветамі дэпутатаў практыкуецца публікацыя ў газеце і на сайтах рашэнняў аб размеркаванні бюджэтных сродкаў. Гэта садзейнічае адкрытасці і празрыстасці расходаў бюджэту. (Лічу, што такую практыку варта замацаваць і ў Бюджэтным кодэксе.)

Яшчэ ў 90-х гадах Більбаа выбраў сваім брэндам турызм і адразу пачаў развіваць усю неабходную інфраструктуру. Вельмі хутка ў 300-тысячным горадзе (па колькасці насельніцтва як горад Гродна) з'явіліся аэрапорт і метро. За карыстанне падземкай для жыхароў быў уведзены асобны падатак.

У турыстычных мэтах яны пайшлі на непапулярныя меры — было знесена буйное прадпрыемства, дзе працавалі 4 тыс. чалавек. За межы горада вынеслі экалагічна небяспечныя прадпрыемствы, якія забруджвалі раку. У далейшым тут з'явілася зона адпачынку. У выніку буйны прамысловы цэнтр стаў культурным цэнтрам рэгіёна. Разам з тым у Більбаа не адмовіліся ад стратэгічна важных прадпрыемстваў, у прыватнасці, захавалася буйная арганізацыя па электразабеспячэнні.

Візітнай карткай горада можна лічыць музей сучаснага мастацтва вядомага іспанскага архітэктара Саламона Гугенхайма, пабудаваны ў сярэдзіне 90-х гадоў. Нам давялося наведаць гэты ўнікальны па сваёй забудове аб'ект. Уваход каштуе 13 еўра. Экспанаты яго такія ж дзівосныя, як і сам будынак, — на першы погляд, ён здаецца пазбаўленым гармоніі, нават нейкім агрэсіўным, аляпаватым, хаця прызнаны адным з самых відовішчных будынкаў у свеце ў стылі дэканструктывізму. Між іншым, мастацкі авангард і сюррэалізм прыцягваюць сюды натоўпы турыстаў! Падчас нашай экскурсіі тут знаходзіліся кітайцы і японцы. У Більбаа стараюцца стварыць добразычлівы імідж горада, гасціннасць тут на першым месцы. Для мясцовых жыхароў вельмі важна, што думаюць пра іх у свеце.

**— А якую падтрымку аказваюць людзям, што апынуліся ў цяжкім жыццёвым становішчы?**

— Нас пазнаёмілі з вопытам работы муніцыпалітэта Данастыя — Сан-Себасцьян. Тут ёсць дом часовага наведвання з бясплатным харчаваннем. Але знаходзіцца там можна не больш за месяц і тое з умовай, што будзеш шукаць працу. Многія гэта разумеюць і не сядзяць склаўшы рукі. Тым, хто знайшоў працу, цэнтр дапамагае з жыллём. Дарэчы, што яшчэ цікава — яны прапануюць даступнае жыллё для тых, хто дасягнуў паўналецця, змог адысці ад сваіх бацькоў і жыве самастойна.

Цэнтры пажылых нечым нагадваюць нашы. Ёсць такія, дзе аказваюць платныя паслугі па доглядзе нямоглых. Тут стала папулярнай практыка прыцягнення сродкаў сталых людзей на праекты, карысныя для іх. Акрамя гэтага, яны маюць яшчэ і матэрыяльныя бонусы. Дарэчы, я нідзе не бачыла пустых земляў. Нават у гарах яны апрацаваны, там ходзяць каровы, авечкі, многа вінаграднікаў. У падзямеллі сховы він аў, можна арандаваць нішу і захоўваць там віно і яно не губляе свае якасці.

**— Праблема мігрантаў вельмі адчувальная?**

— Там прымаюць мігрантаў. Пры гэтым існуе праграма, згодна з якой дзеці мігрантаў павінны не толькі атрымаць адукацыю, але і быць адданымі гэтай зямлі, стаць патрыётамі. Дарослыя мігранты шукаюць працу, як і мясцовыя жыхары. Іх падтрымліваюць, пакуль яны не ўладкуюцца. Мы знаёміліся з работай цэнтра па працаўладкаванні. У сувязі з тым што на тэрыторыі асацыяцыі — а гэта 15 муніцыпалітэтаў — ёсць прадпрыемствы прамысловасці, у тым ліку машына- і суднабудавання, вакол іх створаны невялікія вытворчасці адпаведных камплектуючых, інструментаў, электратэхнікі і г. д. Асацыяцыя мае права накіроўваць туды беспрацоўных. Добры прыклад — электронная дошка, дзе прадстаўлены як вакансіі, так і рэзюмэ саіскальнікаў. З імі, дарэчы, сустракаюцца псіхолагі і даюць рэкамендацыі па выбранай сферы дзейнасці. На той момант было больш за 400 вакансій.



Утылізацыя смецця на вуліцах горада.

**— Што вас найбольш уразіла?**

— Гэта вопыт утылізацыі смецця ў муніцыпалітэце Гальдакаа. На сродкі еўрапейскіх грантаў, мясцовага самакіравання і жыхароў тут устанавілі шведскі завод па зборы і перапрацоўцы адходаў.

Пад'язджаем да нейкага будынка ў цэнтры невялікага гарадка — 4 тысячы жыхароў. Нам кажуць — вось гэта смеццеперапрацоўчы завод. Да жылога дома — 50 м. Стаяць слупкі, у якія людзі кідаюць смецце, і яно падземнымі хадамі ідзе на завод. Сартуецца з дапамогай камп'ютара. Уся арганіка паступае на палі, папера, шкло, пластык — на другасную перапрацоўку. Метад спальвання — учарашні дзень, гэта шкодна для экалогіі, а сарціроўка — сучасны. Зараз у мэрыі працуюць над устаноўкай чыпаў, якія адсочаць, хто колькі разоў выкінуў смецце. За гэта трэба будзе плаціць.

У Беларусі частку расходаў на сферу ЖКГ бярэ на сябе дзяржава. Гэта нараджае ўтрыманскі падыход у насельніцтва. Маўляў, праблема чысціні — гэта клопат камунальнікаў, а не саміх жыхароў. Таму мы не вельмі шануем тое, што нам прыходзіць аднекуль, а калі чалавек на месяцы ўклаў свае сродкі, ён па-іншаму да гэтага ставіцца, бо бачыць, куды ідуць яго падаткі. Больш свядомы падыход усіх жыхароў дазволіў бы знізіць выдаткі на ўтрыманне той жа камунальнай службы.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
*margo@zviazda.by*

### У ТЭМУ

**На што мясцовыя ўлады ў першую чаргу патрацілі б сродкі, калі б іх было больш?**

**Іван КОЗЕЛ, старшыня Пагранічнага сельскага Савета Бераставіцкага раёна:**

— Адрамантавалі б дарогі ў населеных пунктах. Таксама ёсць праблема зносу аварыйных дрэў на могілках. У гэтым годзе было знесена толькі 7 дрэў, на якія патрачана значная частка бюджэту. Казна ў нас невялічкая, бо прадаць участкі складана, ніхто гэтым не цікавіцца, хоць і знаходзіцца наш сельсавет на памежжы. Раней было больш ахвотных тут асталявацца, зараз непакоіць іншая праблема — як пазбавіцца ад пустуючага жылля. Гэты працэс не толькі юрыдычна складаны, але і вельмі затратны. А такіх дамоў у нас амаль чатыры дзясяткі.

**Наталля МАКАЎЧЫК, старшыня Гожскага сельскага Савета Гродзенскага раёна:**

— Вядома ж, заняліся б дарогамі. Самі нанялі б адпаведную арганізацыю і яе кантралявалі. Яшчэ нам неабходна пабудаваць стадыён. У сельсавеце заўсёды ёсць работа па рамонце, добраўпарадкаванні, таму было б добра стварыць сваю ўласную гаспадарчую брыгаду, якая гэтыя работы выконвала б. Фінансы часткова мы можам атрымліваць з продажу зямельных участкаў. Але ажыятажу вакол іх зараз няма, як некалькі гадоў таму, калі з аўкцыёну прадавалі больш за дзясятак. На жаль, мы не ўсё можам фінансаваць, на што ёсць жаданне. Таму хочацца больш самастойнасці ў распараджэнні ўласнымі сродкамі.

ЖЫЛЛЁ МАЁ

# РЭНАВАЦЫЯ ПА-БЕЛАРУСКУ

**Мадэрнізацыя і рэнавацыя жылля — задача перш за ўсё ўласніка, зразумела, пры пэўнай падтрымцы дзяржавы. Калі ў Расіі панясце «рэнавацыі» прадугледжвае знос будынкаў, то ў Беларусі гэта мае на ўвазе паляпшэнне тэхнічных характарыстык і якасцяў дамоў. Пры гэтым стан айчыннага жыллёвага фонду лепшы, чым у Казахстане ці Расіі. Такія думкі агучыў <u>Андрэй РАМАШКА, начальнік упраўлення жыллёвай гаспадаркі Міністэрства ЖКГ Беларусі.</u>**

— Зразумела, што дамы калісьці будаваліся не на зусім доўгую перспектыву, аднак праведзеныя даследаванні, у тым ліку і меркаванні спецыялістаў «Інстытута «Белжылпраект», паказваюць, што будынкі яшчэ могуць эксплуатавацца пры выкананні капітальнага рамонту, — адзначыў ён. — Цяпер амаль увесь шматкватэрны фонд знаходзіцца ў прыватнай уласнасці грамадзян. Таму перш за ўсё гэта задача ўласніка — палепшыць тэхнічныя характарыстыкі свайго жылля. Зразумела, у гэтым пытанні ён не павінен знаходзіцца адзін — патрэбна пэўная падтрымка дзяржавы. Прапрацоўваюцца падыходы ў арганізацыі гэтай падтрымкі для выканання мерапрыемстваў, у тым ліку і па цеплавой мадэрнізацыі, арганізацыі пакватэрнага рэгулявання аснашчэння прыборамі ўліку. З аднаго боку, гэта эканомія сродкаў на ацяпленне такіх дамоў, з іншага — паляпшэнне іх эстэтычнага выгляду, тэхнічнага стану і павелічэнне рыначнага кошту.

Між тым у сталіцы застаюцца шматлікімі звароты грамадзян па пытаннях уцяплення фасада і скаргі на вільгаць у жыллі. Жыхары дагэтуль не могуць прывыкнуць, што пры капітальным рамонце цеплавая мадэрнізацыя фасада больш не робіцца. Выконваецца ўцяпленне, ды і тое, толькі пры паказчыках.

— Уцяпленне — знішчэнне вільгаці і прадзімальнасці — выконваецца пры капрамонце, калі ў доме маюцца праблемы. Для гэтага створана камісія, якая на пасяджэннях Мінгарвыканкама разглядае неабходнасць уцяплення асобна кожнага дома, — падкрэсліла **Валянціна ЧЫГІР, начальнік аддзела ДА «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка».** — Калі існуе праблема ў адной-дзвюх кватэрах, іх можна ўцяпліць, але гэта не сведчыць пра неабходнасць уцяплення ўсяго дома.

Па словах прадстаўніка Мінжылкамгаса, кожны ўласнік павінен разумець, што, інвестуючы сёння ў мерапрыемствы па мадэрнізацыі, ён укладае сродкі ў сваю нерухомасць, кошт якой у далейшым на рынку павялічваецца.

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*

ТАЙМ-АЎТ

## ЗРАБІЦЬ РАМОНТ, НАВЕДАЦЬ МАМУ...

**Лета — любімы сезон адпачынкаў для многіх. Можна выехаць у вёску, на свой дачны ўчастак, а можна паляцець у цёплыя краіны і расслабіцца на пляжы. Не з'яўляюцца выключэннем і нашы парламентарыі.**

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Юрый ДЗЯРКАЧ:**

— Я толькі выйшаў у адпачынак, але ён будзе зусім нядоўгі — два ці тры дні. З чым гэта звязана? Справа ў тым, што 31 жніўня і 1 верасня адбываюцца мерапрыемствы, прымеркаваныя да пачатку навучальнага года. Трэба ўдзельнічаць у сустрэчы ў медыцынскім універсітэце і ў вучылішчах, у адкрыцці інтэрната. Як начальніку ўпраўлення аховы здароўя Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта, мне неабходна прысутнічаць, адказаць на разнастайныя пытанні. Што я буду рабіць падчас свайго адпачынку? Паеду да маці, якая жыве ў Брэсце. Я рэдка яе бачу, будзем размаўляць пра ўсё, пакажу фатаграфіі ўнучкі, якая нядаўна нарадзілася. Стэлефаноўваемся мы часта, а вось убачыцца атрымліваецца не заўсёды.

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па бюджэце і фінансах Валерый БАРАДЗЕНЯ:**

— Я зараз у адпачынку, узяў на тры тыдні. Займаюся рамонтам у сваёй кватэры, усё раблю сваімі рукамі. І мне здаецца, што я, на жаль, не спраўлюся за гэты час. Мой самы лепшы адпачынак? Гэта калі апошнія два гады мы з сябрамі ездзілі на Браслаўскія азёры. Жылі ў палатках. Няхай надвор'е было не самае лепшае — у асноўным, дождж, холад, але ўсё гэта вельмі запомнілася. Немалаважны фактар — кампанія.

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Ірына АКУЛОВІЧ:**

— Мне падабаецца падарожнічаць, і гэта неабавязкова павінны быць нейкія далёкія краіны. Некалькі дзён таму я была ў Нясвіжы на здымках — і атрымала велізарнае задавальненне. Любыя перамяшчэнні, новыя людзі — гэта маё, а вось проста ляжаць не магу. Свой сёлетні адпачынак упершыню ў жыцці я прысвяціла дачцэ Варвары. У гэтым годзе яна пойдзе ў першы клас. І ўпершыню за апошнія 15 гадоў я ўзяла тры тыдні водпуску. Разумела, што трэба правесці час з ёй, таму галоўнае, што 21 дзень я магла трымаць Варвару за руку. Дзе мы адпачывалі? У беларускім санаторыі. Мы і адпачылі, і аздаравіліся. Я падзарадзілася энергіяй і гатова да самааддачай працы.

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Вадзім ДЗЕВЯТОЎСКІ:**

— Не хацелася б скардзіцца, але я падчас свайго адпачынку не адпачываю, а працую. І сёлета выкарыстаў свае адпускныя дні, каб прысвяціць іх працы. У мяне засталося яшчэ 6 ці 7 дзён, якія я планую выкарыстаць у найбліжэйшы час: хачу адвезці свайго сына на мора. На жаль, так атрымліваецца, што калі ў Беларусі цёпла і можна купацца, у мяне самая гарачая рабочая пара. Куды паедзем? Яшчэ не вырашыў, таму што не ведаю, калі дакладна змагу з'ехаць. Буду выбіраць месца, максімальна камфортнае для дзіцяці, дзе сапраўды можна сумясціць аздараўленне, а таксама культурны адпачынак. Асабіста для мяне найлепшы адпачынак — гэта нашы азёры, рыбалка або паход у лес па грыбы. Лічу, што няма адпачынку лепш, чым у Беларусі: у нас цудоўная прырода. Але я ў пэўным сэнсе закладнік сваіх хвароб: ёсць праблемы са спінай, таму мне вельмі дапамагае салёная вада.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**
*lukashevich@zviazda.by*

# ДАРОГІ ВЯДУЦЬ... У БЕЛАРУСЬ?



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

«Напрыклад, людзі могуць працаваць на Белазе, а на Мінскім трактарным заводзе яшчэ і паўдзельнічаць у стварэнні трактара. Дарэчы, пасля дапамогі ў зборцы трактара турыст атрымлівае сертыфікат, у якім напісана, якую мадэль ён сабраў, які яе нумар... Гэта ж выдатна: чалавек, які наведаў Беларусь, напэўна, запомніць такі факт і будзе расказваць сябрам».

Акрамя вышэйназваных, перспектыўным кірункам таксама з'яўляецца лячэбны турызм: людзі прыязджаюць да нас на аперацыі, наведваюць урачоў — напрыклад, стаматолагаў, — візіт да якіх у Еўропе каштуе немалых грошай. Ну і, зразумела, бізнес-турызм.

— Якія ў нас праблемы? Па-першае, гэта інфраструктура. Дзе ўказальнікі на англійскай мове? Так, у цэнтры Мінска іх дастаткова, але ў астатніх гарадах, вёсках па краіне? Па-другое, недастатковы ўзровень сэрвісу. Да ўвядзення бязвізавага рэжыму турыстаў з Расіі і краін СНД усё задавальняла, а вось калі прыйшоў еўрапейскі турыст, мы зразумелі, што чагосьці не хапае, — падкрэслівае Віталь Грыцэвіч. — У тых жа аб'ектах грамадскага харчавання, гандлёвых кропках не хапае ўзроўню англійскай мовы. У Мінску з гэтым яшчэ нядрэнна, але калі выехаць за межы сталіцы... Па-трэцяе, нам трэба прасоўваць краіну, яе брэнд. А для гэтага, на жаль, не выдзяляецца дастаткова грошай.

Каб да нас прыязджала больш людзей, ужо разглядаецца пытанне аб падаўжэнні пяцідзённага бязвізавага рэжыму. Па словах Віталя Грыцэвіча, названы аспект Міністэрства спорту і турызму абмяркоўвае сумесна з Міністэрствам замежных спраў і Міністэрствам унутраных спраў. «Зараз апошнія працуюць над тым, каб падоўжыць тэрмін знаходжання без рэгістрацыі да 10 дзён. Адпаведна, мы будзем прывязвацца да гэтай лічбы».

Большай колькасці турыстаў у Беларусі можа паспрыяць з'яўленне таннага транспарту — напрыклад, лаўкостаў. Танныя авіякампаніі значна палягчаюць перамяшчэнне людзей ва ўсім свеце. Аднак Віталь Грыцэвіч пакуль не гатовы аднесці лаўкосты да неабходных мер. «Не магу сказаць, што яны не трэба, бо тады я буду супярэчыць сусветнаму досведу. Калі разглядаць гэтае пытанне з эканамічнага пункту гледжання, то ясна, што лаўкостам патрэбна загрузка. А Беларусь пакуль не гатовая даць тыя лічбы, якія хочуць мець авіякампаніі. Таксама трэба дамовіцца з аэрапортам аб найбольш ільготных умовах. На жаль, пакуль гэта ўсё на стадыі распрацоўкі», — адзначыў намеснік дырэктара дэпартамента па турызме.

## Погляд знутры

Ксенія КУРУСЬ — дырэктар мінскіх хостэлаў Trinity & Riverside. Яна называе пяцідзённы бязвізавы рэжым не інакш як надзвычай крутым крокам, аднак вельмі спадзяецца, што гэта толькі пачатак. Кожны дзень размаўляючы з турыстамі, якія жывуць у яе хостэле, яна чуе просьбы аб тым, каб тэрмін знаходжання ў Беларусі павялічылі — пажадана, ад 10 да 14 дзён. «Гэта меркаванні людзей, якія прыязджаюць з ЗША, Канады, Аўстраліі і іншых дзяржаў», — адзначае Ксенія.

Акрамя таго, існуе яшчэ адна праблема. «Нядаўна я была ў Вільнюсе. Жыла ў хостэле, там жа сустрэла турыстаў з Брэмена. Я прапанавала ім наведаць Беларусь, яны не былі супраць. Толькі вось калі даведаліся, што на цягніку ўехаць па бязвізавым рэжыме нельга, то адмовіліся. Гэта занадта складана. Для бюджэтных турыстаў, якія едуць да нас, самалёт — дарагаватае задавальненне. Таму калі б я магла нешта парэкамендаваць, то параіла б паспрабаваць адкрыць мяжу для аўтамабіляў і цягнікоў. І, вядома, патрэбныя лаўкосты».

Цэнтральнае пытанне для любога турыста: чым заняцца ў той ці іншай краіне? Ксенія Курусь пацвярджае словы папярэдняга эксперта: праблема інфраструктуры і сэрвісу сапраўды вострая. Персанал, які валодае англійскай мовай, сустракаецца ў сталіцы, аднак у «беларускіх турыстычных Меках» — Нясвіжы і Міры — англійскую разумеюць дрэнна. «Але гэта складана неяк імгненна вырашыць», — прызнаецца Ксенія.

Рэальнае развіццё турызму ў Беларусі ў многім трымаецца на энтузіястах, што пацвярджае і дзейнасць Ксеніі: цэлыя тры гады яна стварае карту Мінска, каб выклікаць «ваў-пачуцці» ў гасцей. «Мы стараемся падабацца, паколькі хостэл — гэта другое месца пасля вакзала, якое бачыць госць, — кажа яна. — Раней у нашым горадзе не было паўнавартаснага даведніка. Мы яго зрабілі, прычым гэта не проста карта: у яе ўбудаваная сістэма бонусаў. Прыходзячы ў нейкае месца, напрыклад, у кафэ, турыст можа паказаць карту і атрымаць дранікі ў падарунак».

Апошнім разам тыраж такой карты склаў 75 тысяч экзэмпляраў. Карта бясплатная, яна ёсць не толькі ў хостэлах, але і ў турыстычных арганізацыях, у аэрапорце. Ксенія і сама развозіць такую надзвычай карысную інфармацыйную прадукцыю па ўсіх магчымых кропках, прысвячаючы гэтаму цэлы працоўны дзень. «У Бельгіі, напрыклад, ёсць артыкул бюджэту, паводле якога выдзяляюцца сродкі на друкарскую прадукцыю для турыстаў. А я раблю гэта за свае грошы», — дадае Ксенія.

Аднак дзяўчына зусім не скардзіцца: яна і далей будзе працягваць развіваць турызм у Беларусі, няхай і сваімі сіламі. Таксама Ксенія лічыць, што неабходна зрабіць так, каб пра Беларусь даведаліся. Сапраўды, брэнд краіны — неабходная дэталь, здольная запусціць увесь механізм, які зменіць уяўленне пра Беларусь замежных грамадзян. «Гэта можа быць ролік пра Беларусь, які можна запусціць на замежныя каналы. І я гатовая фінансава падтрымаць такі крок» — падкрэслівае дырэктар хостэлаў.

Дарэчы, цікавы момант, які наглядна дэманструе даволі свабодную турыстычную нішу ў Беларусі. У Санкт-Пецярбургу існуе 352 хостэлы, а ў Мінску — усяго 17. Дадаць тут няма чаго.

## Дарага і хітра

Лізавета ШАБОВІЧ тры гады стажыравалася ў буйным прыватным атэлі ў сталіцы. Многія беларусы апошнія гады задаюцца пытаннем: хто будзе жыць у дарагіх атэлях, якіх становіцца ў Мінску ўсё больш і больш? Лізавета гатова развеяць міф пра адсутнасць загружанасці. «Так, калі яшчэ было не так шмат атэляў, наш карыстаўся вялікім попытам. Для мінімальнага выжывання гасцініцы трэба 40% запаўняльнасці, а я кожны дзень праглядала статыстыку і магу сказаць, што лічбы былі даволі высокія, дзякуючы, перш за ўсё, бізнес-турызму і наяўнасці казіно, — адзначае дзяўчына. — Усе пытаюцца: навошта гэта будуецца, для каго? Паверце, загрузка ёсць. Дарэчы, і ў дзяржаўных атэлях сітуацыя даволі нядрэнная. Мой знаёмы працуе ў трохзоркавай дзяржаўнай гасцініцы — па яго словах, загрузка ў іх — 80—90%».

— Мінск «заточаны» пад падзеі. Калі ў нас нешта адбываецца, то атэлі не пустуюць, — падкрэслівае Лізавета Шабовіч. — Многія гасцініцы супрацоўнічаюць з рознымі арганізацыямі, таму калі праходзяць буйныя мерапрыемствы, атэль можа быць запоўнены практычна цалкам. Якая максімальная загрузка пры мне была ў атэлі, дзе я працавала? 98%. Вядома, чым больш будуецца гасцініц, тым больш вышэйшая канкурэнцыя. Але гэта дапамагае развіццю сэрвісу.

Дзяўчына працавала ў атэлі як да ўвядзення бязвізавага рэжыму, так і пасля, і лічыць: увядзенне 5 дзён для «аблегчанага» наведвання нашай краіны ніяк не змяніла сітуацыю ў буйных атэлях. «Як ездзілі, так і працягваюць ездзіць. Тым жа бізнес-турыстам без розніцы: ну адмянілі візы, добра, толькі мы і раней прыязджалі. Таму гэты сегмент не моцна змяніўся», — дадала яна.

«Нам трэба зразумець, чаму турыст можа захацець прыехаць у Беларусь. У нас ёсць мноства кірункаў, над якімі працаваць і працаваць, няма сэнсу гэта паўтараць. Дарэчы, пераважнай большасці замежнікаў усё падабаецца. Толькі рускія турысты на маёй памяці выказвалі незадаволенасць сэрвісам і тым, што ў «нас няма чым заняцца», — адзначае Лізавета.

## Замест заключэння

Сёння людзі едуць у Беларусь. Пяцідзённы бязвізавы рэжым няхай і не ідэальны, але ён дазволіў хоць бы ненадоўга зазірнуць у краіну, якая пакуль не трапіла ў спіс абавязковых для наведвання кожным турыстам. І будзем шчырымі: у такі спіс яна трапіць не хутка. Але галоўнае, што ў нашай краіне ёсць людзі, гатовыя рабіць яе лепшай, — няхай і ў асобным хостэле. У рэшце рэшт, чым больш такіх энтузіястаў, тым больш цікавых месцаў для наведвання.

У цэлым, рэкамендацыі экспертаў маюць аднолькавы характар: нам патрэбен брэнд, вобраз. І калі ён будзе сапраўды варты, здолее адлюстраваць нашу культуру і традыцыі, то ніякія межы не спыняць сапраўднага турыста. І, вядома, паляпшэнне сэрвісу, інфраструктуры — неабходныя крокі, паколькі іх невыкананне значна ўскладняе знаходжанне ў Беларусі.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**
*lukashevich@zviazda.by*

ЖЫВЫЯ ЛЕГЕНДЫ

**У Гродзенскай вобласці карыстаюцца папулярнасцю турыстычныя маршруты, якія грунтуюцца на мясцовых паданнях і легендах**

# Крыж на каханні, праклящце свекрыві і кветкі для князёўны

**КОЖНЫ раён распрацаваў свае анімацыйныя праграмы. Як правіла, яны распавядаюць пра гістарычныя аб'екты альбо знакавыя мясціны, героямі якіх былі далёкія продкі ці нават вядомыя гістарычныя асобы.**



У Свіслацкім раёне самай папулярнай у турыстаў з'яўляецца Белавежская пушча. А нядаўна экалагічны маршрут тут «аздобілі» вельмі прыгожай легендай. Яна запісана ў вёсцы Ціхаволя, якая знаходзіцца на рацэ Нарва ў самым цэнтры пушчы. Дырэктар Свіслацкага гісторыка-краязнаўчага музея Анастасія Пекар расказала паданне пра прыгажую-князёўну Кінгу, палац якой некалі стаяў на беразе ракі. Дзяўчына вельмі любіла птушак і часта выходзіла ў лес, каб паслухаць іх песні.

— Але аднаго разу, калі князёўна выйшла ў садок, усё вакол пацямнела, і палац разам з людзьмі праваліўся пад зямлю, а на яго месцы з'явілася горка. І тая горка свяцілася ноччу. Людзі казалі, што сюды вяртаецца маладая князёўна і чакае, калі ёй хто-небудзь прынясе букет кветак. Аднойчы той агеньчык убачыў стары разбойнік і падумаў, што там свеціцца золата. Так яно і было. Кінга сядзела на горцы, а перад ёй стаяў поўны куфар золата. Ад яго і ішло святло. Разбойнік аж анямеў ад такога відовішча, а князёўна кажа яму: «Нарві мне кветак, а я табе золата дам». Але замест таго, каб выканаць просьбу, мужчына кінуўся на дзяўчыну з нажом. Раптам усё знікла, а там, дзе стаяў разбойнік, з'явіўся вялікі камень, які і цяпер ляжыць на гары, — як напамін аб пакаранні тых, хто вельмі прагне багацця, — расказвае Анастасія Пекар.

Цікава, што многія турыстычныя маршруты праходзяць менавіта каля вялікіх камянёў-валуноў, якім прысвечаецца цудадзейная сіла... Сёлета ўпершыню традыцыя пакланення валуну ўнесена ў спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі, а сам гэты камень ахоўваецца дзяржавай як помнік прыроды. Знаходзіцца ён каля вёскі Агароднікі, што ў Ашмянскім раёне, і носіць назву «Нявесцін камень». Яму пакланяюцца па сённяшні дзень.

Работнікі культуры раёна спецыяльна для турыстаў падрыхтавалі анімацыйную праграму, звязаную з народнымі паданнямі. Гэты праект знайшоў падтрымку на міжнародным узроўні і атрымаў еўрапейскі грант для набыцця касцюмаў. Пасля праграмы дзяўчаты прапануюць усім папіць вады з крыніцы, якая цячэ непадалёку.

— Я думаю, што замежныя турыстычныя арганізацыі лічаць такія аб'екты прывабнымі для наведвання, таму наш праект і стаў адным з пераможцаў, — кажа намеснік дырэктара Ашмянскай раённай бібліятэкі Вольга Тарашкевіч, — нядаўна, напрыклад, рабілі праграму для турыстаў з Японіі. Вельмі часта прыязджаюць нашы суседзі — літоўцы і палякі. Усіх кранае паданне, якое мы ўвасобілі ў міні-шоу.

Аказалася, што вакол Нявесцінага каменя ходзіць нямала легендаў. Вольга Тарашкевіч расказала адну з іх, паводле якой у гэты камень ператварылася нявеста, бо не хацела ісці замуж за нялюбага, а будучая свякроў яе за гэта праклала: «Не хочаш ісці замуж за майго сына, ляжы каменем у глыбокім рове». І сапраўды, гэта месца так і завецца — Ромбаўскі Роў.

А сам валун, вагой 74 тоны, стаў сакральным месцам, куды прыязджаюць адусюль, каб дакрануцца да яго, нешта папрасіць і пакінуць прынашэнне.

У спісе легендаў нямала фактаў, звязаных з вядомымі гістарычнымі асобамі. У Воранаўскім раёне расказалі пра камень, які быў сведкам сустрэч вялікага паэта Адама Міцкевіча і замужняй Марылі Верашчакі.

— Яна з мужам графам Путкамерам нейкі час жыла на іх сядзібе ў вёсцы Больцінікі, куды запрасілі і Адама Міцкевіча. Амаль два тыдні яны сустракаліся ў невялікім ляску, за мастком, каля каменя. Тут перажылі мінуты шчасця і разлукі. Марыля вырашыла застацца з мужам і не прыйшла на іх апошнюю сустрэчу. Адаму Міцкевічу нічога не заставалася, як паехаць адтуль. Больш яны не бачыліся, гэта месца стала апошнім сведкам іх сустрэч, — паведаміла дырэктар Воранаўскага цэнтра культуры Ірына Камінская. — Па легендзе, тады ж на камені з'явіўся невялікі крыжык. Кажуць, што яго выбіў Адам, калі яго каханая не прыйшла развітацца. Дарэчы, у паэта ёсць нават верш «Крыж на каханні».

Цікава, але крыж так і не зарос імхом, хоць прайшло амаль дзвесце гадоў. Захавалася і сядзіба графа, тут цяпер знаходзіцца дом культуры. А ў суседняй вёсцы Беняконі каля касцёла пахавалі і саму Марылю.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
*margo@zviazda.by*

**Аляксандр ВЯРСОЦКІ, начальнік упраўлення ідэалогіі, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама:**

— Установамі культуры вобласці праведзена значная этнаграфічная работа па вывучэнні і зборы мясцовых легендаў. Усяго сабрана каля 300 паданняў, з іх 250 атрымана ад носьбітаў аўтэнтычнага фальклору. Для развіцця турыстычнай прывабнасці гэты матэрыял пакладзены ў аснову многіх брэндавых мерапрыемстваў. Падрыхтаваны турыстычныя матэрыялы і анімацыйныя праграмы па сюжэтах мясцовых легендаў.

Распрацавана вялікая колькасць сувенірнай прадукцыі. Напрыклад, фігурка Копціча з мешкавіны, туфелька Свіцязянкі, лялька Барбара, ганчарныя вырабы з чорнай керамікі. Новымі турыстычнымі аб'ектамі нядаўна сталі музей пісанкі ў Сапоцкіне, музейны пакой Уладзіміра Высоцкага ў Навагрудку. Шляхецкія легенды складуць аснову музея ў Падароску Ваўкавыскага раёна. Будзе сабраны матэрыял пра беларускую шляхту.

НОУ-ХАУ

# ПАЛЯВАННЕ НА «ДЗІКАГА» ТУРЫСТА,

## або Аўтэнтычнасць бывае не толькі ў глыбінцы



**Як турыстычны аб'ект гарадскі пасёлак Смілавічы падабаецца нават тым, хто не любіць далёка ад'язджаць ад горада. Цікавае знаходзіцца побач з Мінскам. Сёлета тут павінна стаць яшчэ ўтульней, бо мясцовая ініцыятыва «Развіццё турыстычнага патэнцыялу гарадскога пасёлка Смілавічы» атрымала падтрымку ў рамках праекта «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь», які ажыццяўляецца Праграмай развіцця ААН і фінансуецца Еўрапейскім саюзам.**

### ПРАВІЛЬНЫ МАРШРУТ

Па словах дырэктара прыватнай установы культуры «Спадчына і час» і заяўніка ініцыятывы Юрыя Абдурахманава, з больш чым дзесяцігадовага заяў ад Чэрвеньскага раёна было выбрана ўсяго тры. У тым ліку камісія палічыла перспектыўнай і прапанову са Смілавіч.

Да нядаўняга часу сапраўдна жамчужынай гарадскога пасёлка быў музей «Прастора Хаіма Суціна». Падтрымка, пастаяннае развіццё далі вынік, і ў Смілавічы накіраваўся паток турыстаў. Папулярнымі сталі аўтарскія экскурсіі Тацяны Бембель па мясцовых славутасцях, дамова з турфірмай забяспечыла вялікія групы турыстаў. Стаў зазіраць сюды і так званы «дзікі» турыст — людзі, што вандруюць па ўласным маршруце і распарадку. Вось толькі раней чалавек прыязджаў у незнаёмае месца і губляўся, бо ні паказальнікаў, ні падрабязнай карты знакавых аб'ектаў да нядаўняга часу Смілавічы не мелі.

— Найперш мы прасілі прафінансаваць устаноўку дарожных турыстычных знакаў, — расказвае Юрый Абдурахманаў. — Паказальнікі на музей Суціна будуць размешчаны з боку Мінска і Магілёва. Акрамя таго, у самім пасёлку з'явіцца паказальнік да музея і да палацава-паркавага ансамбля. У планах — надрукаваць турыстычную карту мястэчка з інфармацыяй пра славутасці. Існуе старая карта, але яна не вельмі дакладная і больш расказвае ў агульным пра Чэрвеньскі раён. Мы ж хочам памеціць на паперы знакавыя мясцовыя аб'екты: сукнавальную фабрыку, старыя яўрэйскія могілкі, Татарскую Слабаду з мячэццю і мусульманскія могілкі.

### ЯК РАТАВАЛІ ВЕРБЫ

Палацава-паркавы ансамбль Манюшкаў-Ваньковічаў у Смілавічах цяпер знаходзіцца на стадыі рэстаўрацыі, і колькі яна будзе цягнуцца — невядома, бо будынак належыць уласніку разам з часткай тэрыторыі навокал.

Вядома, што Манюшкі і Ваньковічы прывозілі вельмі рэдкія расліны. Дагэтуль у Смілавіцкім парку захаваліся дзве аўстрыйскія чорныя сасны — унікальныя для Беларусі экзэмпляры, якія нідзе больш у нашай краіне не растуць. Старшыня Смілавіцкага сельскага Савета Валянціна Півавар і намеснік старшыні Ірына Марціновіч падтрымліваюць ідэю засадзіць тэрыторыю дрэвамі. Так мясціна стане не толькі прывабнай эстэтычна, але і ператворыцца ў рэкрэацыйную зону для маці з дзецьмі.

Яшчэ адна вялікая работа ідзе на Панскім беразе. Гэта самы край парку побач з вадаёмам.

— У нас нечакана ўзнікла калізія з мясцовымі жыхарамі, якія напісалі ліст у сельвыканкам і ў раён з просьбай спілаваць старыя вербы, якія перашкаджаюць падысці да самага берага, — кажа Юрый Абдурахманаў. — Але гэта адзіныя дрэвы на тэрыторыі мястэчка, якія засталіся з часоў, калі тут жылі мастакі Парыжскай школы Царфін і Суцін. Спецыяліст з Батанічнага сада ацаніў іх узрост у 130—150 гадоў. У выніку сельсавет зладзіў спецыяльнае пасяджэнне па добраўпарадкаванні, я выступіў у абарону дрэў і, спадзяюся, пераканаў жыхароў.

### ЯК З'ЯЎЛЯЕЦЦА БРЭНД

Надзея Кухарэнка, дырэктар мінскага дызайн-бюро «Ладзес», з энтузіязмам разважае пра стварэнне брэнда для Смілавіч:

— Калі трэба развіць турыстычны патэнцыял мясціны, асноўная задача дызайнера — «адказаць» турысту на тры пытанні: што, дзе і калі. Брэнд мястэчка будзе грунтавацца на знакавых матэрыяльных аб'ектах і перспектыўных фразах-слоганах.

Па-першае, што, на думку арганізатараў, можа стаць сімвалам-сігналам для турыстаў — гэта валёнкі, якія вырабляюць на ўнікальнай не толькі для Беларусі, але і для суседніх краін сукнавальнай фабрыцы. Па-другое, «узнімецца» з руінаў замак Манюшкаў-Ваньковічаў. Што датычыцца нематэрыяльнага брэндзіравання, тут ідэю падказвае... Вікіпедыя. У артыкуле пра Смілавічы першы запіс электроннай энцыклапедыі: «Смілавічы — 1056 метраў над узроўнем мора». Калі гэта цікава абыграць, то слоган падсвядома будзе ўспрымацца як падкрэсліванне вартасці пасёлка, яго вышыні. Надпіс будзе друкавацца на майках, сумках — рэчах, звязаных з маладзёжнай культурай. Яшчэ адзін маладзёжны брэнд схаваны ў самой назве мястэчка. «Смайлавічы» — графічна гэта будзе выглядаць як смайлік замест першай часткі слова.

Каардынатар праекта «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні», які рэалізуе ПРААН у Мінскай вобласці, Аляксандр Шаўчук абяцае, што мясцовая ініцыятыва Смілавіч і надалей будзе мець падтрымку:

— Цяпер Чэрвеньскі раён распрацоўвае пашпарт тэрытарыяльна арыентаванага развіцця — гэта дакумент, у якім раён не толькі фіксуе стан спраў на сёння, але і прапісвае, у якім кірунку ён будзе развівацца. Калі адным з прыярытэтных напрамкаў у Смілавічах стане разгортванне турыстычнага патэнцыялу, то мы гатовыя дапамагчы кіраўніку «Спадчыны і часу» плённа супрацоўнічаць з раённымі ўладамі.

### НУ КУДЫ Ж БЕЗ МІСТЫКІ?

Рэалізацыя ініцыятывы пачалася ў сярэдзіне чэрвеня, а гэта азначае, што работы скончацца да сярэдзіны лістапада. Арганізатары ўпэўненыя, што ў Смілавіч ёсць турыстычны патэнцыял.

Кніжная крама ў цэнтры пасёлка таксама мае перспектывы развіцця. На другім паверсе будынка арганізатары ініцыятывы мараць стварыць турыстычны інфацэнтр, а на вежу прыладкаваць гадзіннік. Дарэчы, так мястэчка набудзе лёгкі флёр містыкі — захаваліся ўспаміны Станіслава Манюшкі пра страшныя гісторыі, якія яму расказваў дзядзька. І калі кампазітар прачынаўся пад бой курантаў, ён садзіўся пісаць оперу «Страшны двор». Хто ведае, магчыма, урывак з гэтага твора на наступны год стане адмярацць час для жыхароў і гасцей пасёлка?

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.** *yurgel@zviazda.by*

СВАЯ ТЭРЫТОРЫЯ

# Хочаш жыць лепш — дзейнічай

## Чым займаецца адзін з найлепшых КОТГСаў сталіцы?


Свята для дарослых і дзяцей.

**НАГАДВАЕМ, што КОТГС — гэта калегіяльны орган тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання. Мікалай БУЙНІЧ, старшыня аднаго з гэтых арганізацый якраз і дабіваецца таго, каб расшыфроўка абрэвіятуры ні ў кога не выклікала пытанняў, а задачы органа самакіравання сталі агульнавядомымі. Каб даведацца, як яму ўдаецца рэалізоўваць свае планы, мы пабывалі на свяце, арганізаваным КОТГСам №118, які адказвае за тэрыторыю раёна 8-га і 9-га кіламетраў на ўсходзе Мінска.**

Мікалай Буйніч на чале арганізацыі ўсяго год, аднак спецыфіку яе дзейнасці паспеў вывучыць дасканала — дапамог дзесяцігадовы досвед працы на кіруючых пасадах. Вакол сябе лідар стараецца збіраць ініцыятыўных і крэатыўных жыхароў раёна — прызнаецца, што ахвотней за іншых ідуць на кантакт маладыя сем'і.

— Мы акцэнтуем увагу не толькі на добраўпарадкаванні, хоць і без вырашэння гэтых пытанняў не абыходзіцца, але і на ствarэнні згуртаванай супольнасці, якой пад сілу справіцца з любымі задачамі. Напрыклад, мы арганізавалі кірмаш, каб назбіраць грошай для дапамогі бацькам дзіцяці-інваліда, якому патрэбна была аперацыя. Да большасці мерапрыемстваў стараемся прыцягнуць дзяцей, каб з самага ранняга ўзросту ў іх фарміравалася свядомае стаўленне да самакіравання. Тым больш склад жыхароў мікрараёна можна назваць вельмі маладым: на нашай тэрыторыі пражывае практычна сем тысяч дзяцей, — расказвае Мікалай Буйніч.

Вось і да пачатку навучальнага года актывісты КОТГСа Ірына Гудзіліна і Ганна Рэут арганізавалі свята, гасцямі якога стала больш за 300 юных жыхароў раёна. У праграме — творчыя выступленні, гульні ад дзіцячага пакоя «33 вітамінкі», дыскатэка з конкурсамі, фотазона, аквагрым, катанне на поні, танцавальны флэшмоб. Пры гэтым за забаўкамі схаваны больш сур'ёзныя выхаваўчыя задачы: на свяце прысутнічалі супрацоўнікі МНС, а кіналагічны цэнтр злаздзіў паказальнае выступленне.

— Наша месцазнаходжанне проста абавязвае нас супрацоўнічаць з прадстаўнікамі сілавых структур. У нас добра наладжаны кантакт з Ваеннай акадэміяй — тым больш, я сам выхадзец адтуль, з воінскімі часцямі. У планах — запусціць сумесныя праекты са Спартыўным камітэтам Узброеных Сіл. У цэлым, спорт — гэта адзін з тых кірункаў, якія хочацца актыўна развіваць. Мы нават думаем у склад арганізацыі ўключыць людзей, якія будуць займацца толькі гэтымі пытаннямі, — адзначыў старшыня КОТГСа.

Мясцовыя жыхары такія імкненні падтрымліваюць. Нават за свае грошы былі гатовыя пабудаваць стадыён, праўда, заняць аблюбаванае месца не дазволілі будаўнічыя нормы. А вось усталяваць шлагбаумы, камеры відэаназірання, уладкаваць клумбы, пабудаваць велагараж за ўласныя сродкі нішто не перашкодзіла.

— Людзі разумеюць, напрыклад, што дзіцячая пляцоўка, якая закладзена па праекце, іх не задавальняе. І без лішніх пытанняў збіраюць грошы на тую, якая ім падабаецца. Нельга ўвесь час спадзявацца на бюджэт, ён вырашае першачарговыя задачы, як, напрыклад, будаўніцтва садка. Хочаш жыць лепш на лакальным узроўні — дзейнічай. Але гэта не азначае, што ўсе пытанні мы вырашаем самастойна — цесна ўзаемадзейнічаем і з ЖЭУ №1 жылкамгаса Першамайскага раёна, яго дырэктар Іна Ясінская сама была ў актыве КОТГСа, таму мы добра адно аднаго разумеем, — заўважыў Мікалай Буйніч.

Ужо двойчы за год КОТГС станавіўся лепшым у раёне, а на гарадскім конкурсе адзначылі работу яго кіраўніка. Толькі на суботнік тут выходзіць больш за 400 чалавек. Пакуль інфармацыя пра дзейнасць арганізацыі распаўсюджваецца пераважна праз месенджары і аб'явы, але ў планах запуск рэкламы, у тым ліку і ў грамадскім транспарце. Магчыма, з'явіцца і свой друкаваны орган, а сама арганізацыя будзе зарэгістравана як юрыдычная асоба. Гэта дапаможа больш актыўна прыцягваць да работы КОТГСа спонсараў, якія і цяпер адгукаюцца на прапановы дапамагчы ў арганізацыі свят. Далей, як упэўнены ўсе мясцовыя жыхары, больш...

**Дар'я КАСКО.** kasko@zviazda.by

**Дэпутат 27-га склікання Мінскага гарадскога Савета, старшыня Пастаяннай камісіі мандатнай, па галоснасці, самакіраванні, правапарадку і міжнародных сувязях Георгій АТАМАНАЎ:**

— Ёсць неабходнасць пільнай увагі з боку дзяржорганаў да развіцця грамадскага самакіравання па месцы жыхарства. Каштоўнасць гэтага рэсурсу будзе толькі ўзрастаць, таму патрэбны праграмна-мэтавы падыход, які прадугледжвае актыўнае ўключэнне ў справу максімальнай колькасці грамадзян.

Грамадскае самакіраванне бачыцца як стройная сістэма, якая складаецца з калегіяльных (камітэты тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання ў мікрараёнах, дамавыя або вулічныя камітэты) і аднаасобных (старшыя невялікіх дамоў і пад'ездаў) органаў грамадскага самакіравання, якія выбіраюцца сходамі грамадзян па месцы жыхарства на тэрмін паўнамоцтваў мясцовых Саветаў дэпутатаў чарговага склікання. У гэтай сістэме знойдзецца месца і органам арганізацый жыллёвых і гаражных спажывецкіх кааператываў, таварыстваў уласнікаў жылых дамоў, маладзёжных жылых комплексаў, саветаў інтэрнатаў.

Пра гэта вельмі важна сказаць цяпер, у сувязі з надыходзячымі ў лютым 2018 года выбарамі дэпутатаў мясцовых Саветаў дваццаць восьмага склікання. Ужо сёння неабходна прадумаць пытанні правядзення да гэтага тэрміну сходаў грамадзян па месцы жыхарства і прыняць неабходныя арганізацыйныя меры для фарміравання новых складаў органаў грамадскага тэрытарыяльнага самакіравання на наступныя чатыры гады.

# З НІЧЫЙНАГА ДОМА — СТЫЛЬНАЯ ДАЧА

## Аб некаторых асаблівасцях выканання Указа №100 у прыгарадным сельсавеце

**Гэта памылка — думаць, што ў прыгарадным сельсавеце няма праблем са старымі трухлявымі дамамі. Яны ёсць. Хоць варта ўсё ж адзначыць, што вёскі Лышчыцкага сельсавета Брэсцкага раёна выглядаюць даволі дагледжанымі і прывабнымі. Нават на ўскраінах няма такога запусцення, паваленых агароджаў, хацін з дзіравымі стрэхамі, якое можна сустрэць у аддаленых населеных пунктах глыбінкі. Апусцелыя дамы і ўчасткі тут хутка купляюць. Асабліва ў вёсках па дарозе на Брэст.**

Але пытанні з нічыйнымі пабудовамі на вялікай тэрыторыі ўсё ж перыядычна ўзнікаюць. Іх даводзіцца вырашаць сельвыканкаму. У 17 вёсках сельсавета пражывае амаль 4700 чалавек. Вядома, аграгарадок Астрамечава альбо вёску Лышчыцы не параўнаеш з Малымі Сухарэвічамі, у якіх засталося восем пажылых жыхароў. Але нават у вялікіх густанаселеных вёсках, здараецца, сыходзіць з жыцця адзінокі чалавек, а яго жытло застаецца нікому не патрэбным. Альбо сваякі пражываюць надта далёка, каб цікавіцца сельскай нерухомасцю. Што ўжо казаць пра вёскі меншыя? Вось і ў Лышчыцкім сельсавеце за апошнія гады знеслі сем дамоў, а ўчасткі перадалі пад сельгасугоддзі. Зараз на тэрыторыі адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі таксама ёсць дамы, якія рашэннем райвыканкама прызнаныя непрыгоднымі для пражывання.

Са **старшынёй сельскага Савета Інай ДЗЯЧЭК** накіроўваемся ў вёску Пагубяцічы. Паводле слоў Іны Анатольеўны, тут маем прыклад таго, як населены пункт стаў пакрысе ажываць, хоць нейкае дзесяцігоддзе таму быў устойлівым кандыдатам на паступовае згасанне.

— Менавіта тады я толькі стала старшынёй, прыехала ў вёску, агледзелася, — расказвае кіраўнік мясцовай улады. — І выгляд вось гэтага закінутага, зарастаючага пустазеллем дома на краі вуліцы навеяў нейкую роспач. З калегамі мы правялі ўсю неабходную падрыхтоўчую работу, сабралі дакументы і прадалі дом з аўкцыёну тады яшчэ па 70-м Указе. Хату купілі брастаўчане Галіна і Віталь Дацкевічы, як аказалася, руплівыя гаспадары, людзі з надзвычай умелымі рукамі. Праз некалькі гадоў Віталь так адрамантаваў, рэканструяваў, перамяніў былую пабудову, што яе стала проста не пазнаць. Гаспадары добраўпарадкавалі двор, разбілі сад, газоны засадзілі кветкамі. І хоць пастаянным іх месцам жыхарства застаецца па-ранейшаму горад, але тут сям'я праводзіць лета, садзіць і даглядае агарод. Больш за тое, галава сям'і дапамагае многім аднавяскоўцам вырашаць розныя тэхнічныя пытанні, бо ўсё ўмее. А імкненне Галіны і Віталя ствараць прыгажосць вакол сябе стала прыкладам для многіх.

Пазней у вёсцы яшчэ адзін дом прадалі з аўкцыёну, а два зусім трухлявыя знеслі, і населены пункт стаў канчаткова не падобным на выміраючую вёску. Хоць тут няма ні крамы, ні іншых аб'ектаў інфраструктуры, але харашэюць дамы, побач з якімі з'яўляюцца дзіцячыя арэлі, цвітуць кветкі, — працягвае Іна Дзячэк.

